PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 6 (2439) Год XLVIII Беласток, 9 лютага 2003 г. Цана 2,00 зл.

Грошы — як дабро і зло інтэграцыі

Уладзімір Лапцэвіч

Студзеньская сустрэча ў беларуска-расійскіх вярхах, якая афіцыйна называлася пасяджэннем Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, аказалася даволі цікавай з пункту гледжання далейшага развіцця падзей. У бліжэйшай перспектыве праявіліся два галоўныя напрамкі так званай інтэграцыі — усталяванне кантролю буйнога расійскага капіталу над патрэбнымі яму беларускімі прадпрыемствамі і інтэнсіфікацыя работы па ўвядзенні расійскай валюты, а значыць, ліквідацыі беларускай валюты.

Панславісцкая рыторыка як ідэйны стрыжань „саюзнай дзяржавы" істотна аслабла ў мінулым годзе пасля гучных заяў расійскага прэзідэнта аб „мухах і катлетах" аб'яднаўчага працэсу і на першы план выйшла эканоміка. А калі больш дакладна — расійскія эканамічныя інтарэсы ў Беларусі. Канфлікты і сваркі паміж Лукашэнкам і Пуціным сталі вынікам нежадання першага страчваць уласны кантроль над беларускай эканомікай, якая называецца дзяржаўнай. Разам з тым, разуменне магчымасці страціць у хуткім часе палітычную ўладу, бо без расійскай падтрымкі палітыка А. Лукашэнкі не на многае здольная, вымусіла беларускага лідэра пайсці на саступкі. Праўда, гэтыя саступкі на даны момант носяць вербальны характар, гэта значыць з'яўляюцца пакуль чарговымі абяцаннямі.

Што ж непасрэдна стала вынікам вышэйадзначанага пасяджэння і папярэднячай яму прэзідэнцкай размовы? Вынік пасяджэння будзённы — прыняццё „саюзнага" бюджэту і абмеркаванне далейшых шляхоў будаўніцтва Саюза. Цікава, што Беларусь, пра што намякнуў па заканчэнні ўсіх перамоў Пуцін, завінавацілася ў гэты самы „саюзны" бюджэт за два папярэднія гады амаль паўтара мільярда расійскіх рублёў. На 2003 год памер расійска-беларускай скарбонкі — каля 3 млрд. расійскіх рублёў. Параўноўваючы такія лічбы, прыходзіш да высновы, што ўмее афіцыйны Мінск жыць за чужы рахунак.

Але па ўсім відаць, што расійскія ўлады і расійскі капітал не такія цярплівыя як беларускі народ. І калі яны за нешта плацяць, то і хочуць самі заказваць музыку. Такі заказ — у канкрэтнай прэтэнзіі на беларускую дзяржаўную газатранспартную сістэму і, не больш не менш, беларускія грошы.

Калі патрабаванне акцыянаваць дзяржаўны „Белтрансгаз" летась выклікала моцнае абурэнне беларускага прэзідэнта, то цяпер ён заявіў, што да ліпеня гэтага года з'явіцца сумеснае расійска-беларускае газатранспартнае прадпры-

[працяг ☞ 2]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Калектыў „Гама" з Чыжоў

Больш і менш традыцыйнае калядаванне

Аляксей Мароз

У XXIV Павятовых сустрэчах калядных калектываў, якія 19 студзеня 2003 года арганізавалі Гайнаўскі дом культуры і Гайнаўскі аддзел БГКТ, прынялі ўдзел 23 калектывы — разам каля 400 удзельнікаў. Большасць каляднікаў паказалі высокі ўзровень спеву.

Мерапрыемства адкрыў новаабраны дырэктар ГДК Андрэй Скепка і раней выконваючая абавязкі дырэктара Ядвіга Кучкін. Сярод выступаючых былі пераможцы Гайнаўскіх спатканняў з праваслаўнай калядкай, вясковыя калектывы з Гайнаўшчыны і дзіцячы калектыў „Perełki" касцёла Уздзвіжання Святога Крыжа ў Гайнаўцы.

— Звяртаем увагу на традыцыйныя формы калядавання і чыстае выкананне твораў. Новыя формы з дапамогай музыкі не падыходзяць да нашага агляду, — заявіў старшыня камісіі Сцяпан Копа з Ваяводскага асяродка анімацыі культуры.

Традыцыйнае калядаванне і вельмі прыгожы чысты спеў прэзентавалі жанчыны з вясковых калектываў „Арэшкі" з Арэшкава і „Вульчанкі" з Вулькі-Тэрахоўскай. Выступілі яны ў вясковых зімовых вопратках і цёплых хустках. Выгляд заўважыла конкурсная камісія, высылаючы іх на XXII Ваяводскія спатканні калядных калектываў. Сярод вясковых выканаўцаў добра прэзентаваліся спевакі з Курашава, якія выступілі ў двух калектывах. Старэйшыя жанчыны прыгожа і натуральна спявалі як калектыў „Незабудкі", а асобна выступілі члены музыкальнай сям'і Несцерукоў. Добра прэзентаваліся таксама калектывы „Чыжавяне", „Збучанкі", „Нараўчанкі" і „Цаглінкі".

— Найбольшую ўвагу звярталі мы на сувязі калядуючых з традыцыяй, бо гэтага патрабаваў рэгламент конкурсу. Аднак, не ўсе каляднікі вярталіся рэпертуарам і вопраткай у мінулае. Некаторыя спявалі калядкі так, як спяваецца іх у цэрквах або прэзентавалі сучасныя апрацоўкі, але гэта таксама вартаснае і цікавае калядаванне, — сказала Анна Баран, член конкурснай камісіі. — Узровень выканання калядак быў вельмі высокі і таму рашыліся мы вылучыць на ваяводскі агляд больш калектываў чым прадбачвае рэгламент конкурсу. Усе адабраныя каляднікі паказалі вельмі прыгожы спеў.

На XXII Ваяводскія спатканні калядных калектываў былі кваліфікаваны калектыў „Рамонка" з Ласінкі, які паказаў чысты і прыгожы спеў, каляднікі з Гайнаўскай белгімназіі, якія патрапілі стварыць святочную атмасферу на сцэне, вучні з Комплексу агульнаадукацыйных школ з Гайнаўкі, дзеці з Падставовай школы ў Чаромсе, дзіцячы хор Schola „Perełki" касцёла Уздзвіжання Святога Крыжа ў Гайнаўцы і гайнаўскія белліцэісты з калектыву „Знічка".

— Вучні са „Знічкі" выступілі геніяльна. Ацэньваючы іх паводле вакальных магчымасцей, можна сказаць, што перамаглі ўсіх, — лічыць член камісіі Анна Баран. — Выступленне моладзі адрознівалася аднак ад традыцыйнага калядавання.

Вядучая Наталля Зофія Лемеш інфармавала публіку пра калектывы і хоры, якія выступалі на сцэне ГДК і знаёміла з гісторыяй іх дзейнасці. Многім

[працяг ☞ 3]

Памяркоўны адвакат ☞ 4

Як у выказваннях шэфа польскай дыпламатыі, так і ў пераважнай большасці паслоў вынікала, што за ўсходняй мяжой павінны мы шукаць сабе партнёра ў наступным парадку: у Літве і Украіне, у Расіі, а наканец у Беларусі. Нават экстравагантны Габрыель Яноўскі пагадзіўся са сцвярджэннем, што Еўропа не будзе канчацца на Бугу.

Еднасць з роднай зямлёй ☞ 5

1909 год стаў лёсавызначальным для Канстанцыі Антонаўны. Газета „Наша ніва" друкуе яе верш „Хвоя". У знак сімпатыі да аўтаркі Я. Купала ў 1910 годзе на сваім вершы „Мая думка" напісаў: „Прысвячаю Канстанцыі Буйло". У адказ атрымаў „Звон" з прысвячэннем. Завязалася перапіска, вынікам яе стаў адрэдагаваны Я. Купалам зборнік „Курганная кветка", які ўбачыў свет у 1914 годзе.

Не парываць з традыцыяй ☞ 8

Кіназала ў Беларускім музеі пад канец года была адмалявана і мне здавалася, што вядзецца падрыхтоўка да навагодняга балю па старым стылі. Аднак сталася інакш. 13 студзеня г.г. дзверы Беларускага музея ў Гайнаўцы былі зачынены. Для многіх прыхільнікаў беларускіх навагодніх баляў быў гэта свайго роду шок.

Гвязда і калядаванне ☞ 9

26 студзеня многа людзей прыйшло паглядзець 30 груп калядоўшчыкаў, якія прыехалі ў Клуб забавы „Круг" у Беластоку з розных куткоў Беласточчыны. Мерапрыемства арганізавала Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Бяссільны ў моцнага заўсёды вінаваты ☞ 10

У Гродне войска многа было. Нашы свіней білі і ў Гродна вазілі. Пры ўездзе ў горад мяса штэмпелявалі і пазней прадавалі. Плацілі 16 рублёў за худую саланіну і 18 рублёў за тоўстую. Гарэлка „Маскоўская" каштавала 16 рублёў за літр, пустая бутэлька — 1 рубель.

Афрыканскія страусы марозаў не баяцца ☞ 11

Сёлета ўпершыню зімуем страусаў у нашай гаспадарцы. Адну пару трымаем ад ліпеня. Пабудавалі мы ім цёплы домік у афрыканскім стылі. Яны не баяцца халадоў і ў сёлетнія студзеньскія маразы пад -20°C яны ахвотна прабывалі вонкі. Калі ішоў снег, дык яны былі як чарапахі.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Аб пасяджэнні праўлення аб'яднання Польшча-Беларусь

30 студзеня г.г. у Варшаве адбылося пасяджэнне Галоўнага праўлення грамадскага аб'яднання Польшча-Беларусь, якое было прысвечана абмеркаванню праграмы дзейнасці арганізацыі на 2003 год. У пасяджэнні прынялі ўдзел як прадстаўнікі цэнтральных улад, так і кіраўнікі рэгіянальных аддзелаў аб'яднання з Беластока, Любліна, Лодзі, Гданьска, Бялай-Падляшскай і іншых гарадоў Польшчы.

Падчас выступленняў была адзначана важнасць далейшага развіцця кантактаў паміж Беларуссю і Польшчай, паглыбленне супрацоўніцтва ў сферах эканомікі, культуры, навукі, турызму і г.д. Падкрэслена неабходнасць пашырэння ўзаемадзеяння дзвюх краін на вышэйшых узроўнях улады.

Галоўнае праўленне ўхваліла праграму дзейнасці аб'яднання на 2003 год, якая ўключае правядзенне IX Алімпіяды беларускай мовы ў Польшчы, выступленні беларускіх фальклорных калектываў, арганізацыю гандлёвых місій прадпрымальнікаў, дапамогу ў развіцці партнёрскіх сувязей гарадоў, вучэбных устаноў, прадпрыемстваў, арганізацыю адпачынку дзяцей з Беларусі ў Польшчы і іншыя мерапрыемствы.

У ходзе пасяджэння былі выказаны меркаванні аб неабходнасці актывізацыі дзейнасці аб'яднання ў кірунку мінімізацыі негатыўных наступстваў уступлення Польшчы ў ЕС, увядзення Польшчай з 1 ліпеня г.г. візавых адносін.

Па запрашэнню аб'яднання Польшча-Беларусь у пасяджэнні прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Павел Латушка і саветнік Пасольства Сяргей Іваноў. Прадстаўнікамі дыпламатычнай установы была адзначана важнасць дзейнасці арганізацыі для развіцця беларуска-польскіх дачыненняў, былі прадстаўлены канкрэтныя прапановы па супрацоўніцтве ў сферы эканомікі, культуры і ў рамках рэгіянальных кантактаў.

www.mfa.by

ТБМ застаецца папярэджаным

Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь пад старшынствам Валеры Самалюка вынес рашэнне па скарзе грамадскага аб'яднання „Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" (ТБМ) у сувязі з пісьмовым папярэджаннем Міністэрства юстыцыі, якое было вынесена арганізацыі 26 лістапада 2002 г.

Як паведаміў БелаПАН старшыня ТБМ Алег Трусаў, Вярхоўны суд пакінуў у сіле пісьмовае папярэджанне Мінюста. Папярэджанне было вынесена ў сувязі з незаконнымі, з пункту погляду міністэрства, дзеяннямі Лідскай гарадской арганізацыі (Гродзенская вобласць), актывісты якой паставілі ў верасні леташняга года мемарыяльны крыж у вёсцы Беліца Лідскага раёна ў гонар сваіх продкаў. Дазвол на ўсталяванне крыжа даў мясцовы сельсавет. Аднак Мінюст расцаніў гэты знак як „культавае ўзвядзенне" і абвінаваціў актывістаў арганізацыі ў правядзенні несанкцыянаванага мітынгу ў дзень усталявання крыжа.

Яшчэ адна прэтэнзія Мінюста была звязаная з адсутнасцю афіцыйнай назвы ТБМ у тэксце рэкламнага лістка, размешчанага ў вагонах мінскага метро. Алег Трусаў заявіў: „Мы выдатна разумеем, у якой краіне мы жывем, і разумеем, што асудзіць Мінюст Вярхоўны суд проста пабаяўся, каб не стварацъ прэцэдэнту".

Навіны Хартыі '97

У Беларусі разглядаецца магчымасць будаўніцтва магутнай вугальнай электрастанцыі

У Беларусі разглядаецца магчымасць будаўніцтва магутнай электрастанцыі на вугалі. Прапанова сумесна рэалізаваць гэты праект была накіравана ўраду Польшчы. Паводле слоў міністра энергетыкі Беларусі Уладзіміра Сямашкі, ініцыятыва будаўніцтва на тэрыторыі нашай краіны вугальнай электрастанцыі магутнасцю 660 мегават сустрэта палякамі з цікавасцю. Бакі дагаварыліся аб стварэнні рабочай групы, якая да канца 2003 года распрацуе тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне праекта. Папярэдне аб'ём неабходных інвестыцый ацэньваецца ў 950-980 мільёнаў долараў.

Калі такі праект будзе рэалізаваны, Беларусь атрымае магчымасць умацаваць сваю энергетычную бяспеку, зменшыць залежнасць ад імпарту прыроднага газу. Выпрацоўка электраэнергіі на вугалі сёння абыходзіцца больш танна, чым на „блакітным паліве".

Мілена Ануфрыёнак, Белта

Інфармацыйная прастора Беларусі

Паводле даных на 1 студзеня гэтага года, на інфармацыйнай прасторы Беларусі прадстаўлены 54 праграмы тэлевяшчання і 160 праграм радыёвяшчання, 8 інфармагенцтваў і 1 347 перыядычных выданняў. Штомесяц рэгіструецца 5-6 новых друкаваных органаў і столькі ж пакідае гэты рынак.

Дарэчы, у мінулым годзе выдадзена 59 новых ліцэнзій на выдавецкую дзейнасць. У цэлым па рэспубліцы выдадзена 7 753 назвы кніжнай прадукцыі, з якіх „на рахунку" дзяржаўных выдавецтваў — 569 кніг, якія выйшлі тыражом 7 мільёнаў экземпляраў. Аднак сітуацыю на кніжным рынку Беларусі нельга назваць добрай. Больш як 90 працэнтаў прадстаўленых на ім кніг выпушчаны расійскімі выдавецтвамі.

Алена Прус, Белта

Планета малпаў

Слухаючы 22 студзеня сеймавае выступленне міністра замежных спраў Владзімежа Цімашэвіча, а пасля дыскусію на тэму замежнай палітыкі Польшчы з удзелам паслоў Саюза левых дэмакратаў, Грамадзянскай платформы, Права і справядлівасці мелася ўражанне, што Ірак пагражае бяспецы Польшчы. Польскія палітыкі адным хорам заяўляюць, што хочуць ісці на вайну з азіяцкай краінай, з якой Польшча не мае ніякіх дачыненняў і ніякіх канфліктаў. Яраслаў Качынскі, які марыць аб кіраванні краінай, адкрыта гаварыў: „Ta wojna jest naszą wojną i powinniśmy dopuszczać nawet drastyczne środki, aby wygrać tę wojnę". Пару дзесяткаў гадоў таму вялікі канцлер Рэйха пачынаючы вайну з Польшчай гаварыў сваім генералам: „Дапускаюцца ўсе сродкі, каб выйграць вайну. Не майце літасці. Пераможцаў ніхто судзіць не будзе".

Чытаючы і слухаючы найважнейшых палітыкаў ды публіцыстаў у краіне, задумоўваюся ці ў палітыцы і прапаганде бываюць якія-небудзь межы подласці. Практыка апошніх гадоў, а асабліва агрэсіі НАТА на Югаславію ў 2000 г., паказвае, што можна напасці на любую краіну, зраўняць з зямлёю некалькі гарадоў і аб'явіць свету, што ўсё гэта было неабходным дзеля сусветнай бяспекі, дэмакратыі і чалавечых правоў. Найбольш прыгнятала прапаганда. Ад прэзідэнта да закамплексаванага правінцыйнага журналіста ўсе паўтаралі пра гуманітарны аспект гэтай вайны і выказвалі сваё захапленне ад поспехаў амерыканскай авіяцыі ў разбурэнні невялікай еўрапейскай краіны.

26 студзеня гэтага года раніцай радыё паінфармавала, што ўначы ізраільскія танкі занялі палесцінскае мястэчка, салдаты забілі 12 чалавек, 18 палесцінцаў у безнадзейным стане, а 50 атрымалі цяжкія раненні. Яўрэйскае войска разбурыла пару дзесяткаў дамоў і раніцай вярнулася ў свае гарнізоны. У дэмакратычных краінах свету не было ніякіх пратэстаў. Усё адбылося як у фільме *Планета малпаў*, дзе малпы, дамінуючы гатунак у свеце, час ад часу арганізавалі карныя экспедыцыі супраць людзей у рэзервацыях.

Няшчасце Ірака заключаецца ў тым, што распараджаецца найбольшымі залежамі нафты ў свеце. Амерыканская гаспадарка, якая пахіснулася ў выніку шаленчай атакі пару мусульманскіх тэрарыстаў, патрабуе таннай сыравіны. Ахвярай, якая мае заплаціць за амерыканскі крызіс, прэзідэнт Буш прызначыў Ірак. І ніхто не стрымае амерыканцаў ад агрэсіі на гэтую краіну. Амерыка не мае сёння супрацьвагі ў свеце, толькі пару дзесяткаў васалаў. Ёсць краіны, як Нямеччына ці Францыя, якія прабуюць гаварыць сваім голасам, але іх мілітарны патэнцыял нічога не вырашае ў сучасным свеце. Расіі пагражаюць новыя ўнутраныя канфлікты, а стан гаспадаркі, карумпаваныя эліты і знішчанае бальшавізмам грамадства вывелі гэту краіну на перыферыі вялікай палітыкі. Ірак фармальна з'яўляецца саюзнікам Расіі, як была ім Югаславія, але тое, чаго можа Гусейн чакаць ад Масквы, гэта толькі жэст занепакоенасці амерыканскай палітыкай.

Амерыканцы, рыхтуючыся да вайны, правялі таксама спецыяльныя курсы для журналістаў, якіх вызначылі для інфармацыйнага абслугоўвання ваеннай аперацыі. Узнікае новае разуменне свабоды слова. Вайну будуць паказваць толькі выбраныя журналісты, якіх раней правучылі як гэта рабіць. Таму неўзабаве праўдападобна пабачым, як падымаюцца ўверх бліскучыя крылатыя самалёты, а пасля вяртання з палёту маладыя хлопцы ў форме будуць усміхацца перад камерамі і, мабыць, гаварыць пра сваё змаганне за свабоду іракскага народа. Забітых, гэтымі задаволенымі з сябе хлопцамі, людзей напэўна не пакажуць. Хаця амерыканская армія не запрасіла на ўспомненыя курсы зорку польскай журналістыкі Вальдэмара Мілевіча, але яго рэпартажы па тэлебачанні не будуць наводзіць ніякіх сумненняў. Дакажа ён, што бомбы, якія зраўняюць з зямлёю Багдад, нясуць свету, у тым ліку і Польшчы, мір, дабрабыт і бяспеку.

Bomby spadające na Belgrad, — гаварыў прэзідэнцкі міністр Марэк Сівец у маі 2000 г., — to są bomby niosące pokój.

Яўген Міранові ч

Грошы — як дабро і зло інтэграцыі

[1 ☞ працяг]

емства. Паверыць у гэта лёгка, бо не так многа часу для таго, каб даць „газавым" пераўтварэнням „задні ход". Што ж тычыцца другога чынніка інтэграцыі — з'яўлення адзінай грашовай адзінкі Саюза, то тут пакуль не ўсё зразумела, як здаецца на першы погляд. Палітаглядальнікі лічаць, што найгалоўнейшай задачай Пуціна ў Мінску было вырашэнне канчатковай даты ўвядзення расійскага рубля ў якасці адзінага плацёжнага сродка на „саюзным" абшары. Фармальна гэта адбылося — разлічвацца ў магазінах валютай суседняй дзяржавы беларусы магчыма стануць з 1 студзеня 2005 года. Вядома, што раней расійскі прэзідэнт настойліва прапаноўваў зрабіць такія змены годам раней, але, як бачна, пайшоў на некаторыя саступкі А. Лукашэнку.

Калі прыгадваць гісторыю „станаўлення" рублёвай зоны, якая налічвае ўжо роўна 10 гадоў, падаецца, што яшчэ наступныя два стануць часам чарговых пошукаў непераадольных перашкод. Хаця першыя зрухі нібыта гавораць аб адваротным. Літаральна праз некалькі дзён пасля гучных заяў, беларускі прэзідэнт даручыў прэм'ер-міністру актывізаваць пошук хутчэйшых магчымасцей увядзення ў абарачэнне ў Беларусі расійскай валюты, а кіраўнік Нацыянальнага банка П. Пракаповіч заявіў аб планаванні ўвядзення з 1 ліпеня гэтага года ў паралельнае абарачэнне ў краіне безнаяўнага расійскага рубля. Праўда, зрабіў агаворку, што пакуль існуючая банкаўская тэхніка не дазваляе лічыць адразу ў дзвюх валютах. Цікава, што і самае галоўнае ў дадзенай праблеме пытанне аб эмісійным цэнтры застаецца адкрытым. Той жа Пракаповіч кажа, што менавіта яго мусяць вырашыць бліжэйшым часам Беларусь і Расія. Беларускі бок мае спадзяванні, што расіяне пагодзяцца адмовіцца ад манапольнага валодання ўласным друкарскім станком.

Такім чынам, для Крамля на даны момант самае галоўнае перавесці Беларусь на свае грошы. Задача Лукашэнкі — не страціць кантроль над жывучай за расійскі кошт беларускай эканомікай, а значыць і фінансамі. Бо гэта асноўныя чыннікі яго палітычнага існавання. Таму саюзнае будаўніцтва сапраўды будзе працягвацца.

Уладзімір Лапцэвіч

Цікавей у кулуарах

— А-ёйку, і аб чым тут пісаць?! — наракалі журналісты, кружачы па калідорах Ваяводскай управы ў час апошняга пасяджэння Падляшскага сейміка.

Ужо з парадку нарады вынікала, што нічога асаблівага самаўрадаўцы не ўрадзяць. Шмат з пунктаў датычыла працэдурных і фармальных змен, вось, хоць бы такіх, што краналі б дагаворанасці кошту аднаго пункта ў табліцы месячных ставак аплаты штату работнікаў Цэнтра адукацыі настаўнікаў (6 зл. у Сувалках і 5 зл. у Беластоку), прадстаўленай членам Падляшскай управы Янам Сычэўскім.

Найбольш працяглую дыскусію выклікаў пункт, які датычыў ліквідацыі Рэгіянальнага асяродка грамадскай палітыкі ў Беластоку і ўваход яго (разам з людзьмі) у адпаведнае ведамства Маршалкоўскай управы. На думку ўправы, такім чынам зэканоміцца толькі ў гэтым годзе 130 тысяч злотых. А на думку апазіцыі і, галоўным чынам, яе прадстаўніцы Альжбеты Каўфман-Сушко (якая між іншым стварала гэты асяродак), ашчаднасці могуць рэальна сягаць толькі 50 тысяч зл., а ліквідуецца ўстанова вельмі заслужаная, хоць бы з прычыны досведу ў абучэнні працаўнікоў грамадскіх служб. Член управы Караль Тыленда і маршалак Януш Кшыжэўскі супакойвалі, што пасля змен у структурах нічога не зменіцца, а віцэ-старшыня Сейміка Адам Дабронскі падкрэсліў, што пераўтварэнне ніяк не паўплывае на памяншэнне коштаў прызначаных у ваяводстве на грамадскія мэты. У рэшце рэшт галасамі кіруючай у ваяводстве левай кааліцыі ліквідацыя РАГП стала фактам.

Цікавай чакалася дыскусія над зменамі ў ваяводскім статуце. Аднак, гэты пункт быў зняты з прычыны розных няяснасцей, якія вынікалі з праекта змен. Вось, як, напрыклад, трактаваць прыезды на пасяджэнні Сейміка з небеластоцкіх мясцовасцей: лічыць іх як элемент „дыеты", ці службовыя камандзіроўкі.

Вялікая напруга адчувалася перад спробай выбару Надзвычайнай камісіі Ваяводскага фонду аховы асяроддзя. Сеймік вылучае пяць з дзевяці яго членаў. Да гэтага часу дамінавала ў ім правіца. Як чулася ў кулуарах, яшчэ не дагаварыліся, каго вылучыць і як мае выглядаць падзел месцаў паміж апазіцыяй, кіруючай левіцай і Самаабаронай. Канчаткова і гэты пункт быў зняты з парадку дня, да таго аднагалосна.

Больш цікава чым на пасяджэнні было ў кулуарах Падляшскай ваяводскай управы, дзе таксісты ўручалі ваяводу Марку Стшалінскаму пратэст супраць увядзення ў таксі фіскальных касаў (фінансава, кажуць таксісты, не справяцца). Тут таксама нервова пахаджваў дырэктар Псіхіятрычнай бальніцы ў Харошчы. З планаў Падляшскай управы вынікае, што хочуць ліквідаваць прышпітальную гадоўлю свіней (каля 400 штук), а 110 гектараў шпітальных грунтаў прызначыць на будаўнічыя ўчасткі для продажу за найменш 30 мільёнаў злотых (частку грошай мае атрымаць задоўжаны шпіталь).

Мацей Халадоўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Традыцыйныя калядкі спявалі жанчыны з Курашава („Незабудкі")

Больш і менш традыцыйнае калядаванне

[1 ☞ працяг]

гледачам спадабалася выступленне калектыву „Гама" з Комплексу школ у Чыжах, які падрыхтаваў традыцыйныя калядкі, і дзіцячага хору прыхода Нараджэння св. Іаана Хрысціцеля ў Гайнаўцы, якія спявалі вельмі дынамічна. Прыгожыя калядкі прэзентавалі каляднікі з Дубін, Дубіч-Царкоўных, Падставовай школы ў Арэшкаве, Гімназіі н-р 1 у Гайнаўцы і дашкольнікі з Самаўрадавых прадшколляў н-р 5 і н-р 1. Пасля выступлення дашкольнікаў паявіліся ўсмешкі радасці на тварах бацькоў. Сабраныя заўважылі ў наймалодшых удзельнікаў вялікую ахвоту да спявання.

Аляксей Мароз

Разнароднасць па-падляшску

Каляды гэта прыемны час. Бывала, паедзем да бабулі-дзядулі , а там каляднікі, гвязды, снег і спеў! Бывала, і было, бо ўжо так няма. Зараз святкуем у горадзе. Каляднікі, праўда, і тут ёсць, але крыху іншыя, на жаль. Першае, што іх адрозніваe, гэта рэпертуар. Здаецца, ведаюць яны толькі адну калядку. Прызнаюся, што і мая прабабуля як першую спявала мне „Рожджэство Хрыстово", але ці гэта абазначае, што ўсе і паўсюль маюць спяваць толькі тое?! А дзе арыгінальнасць?

У Гайнаўцы арыгінальнасць знайсці можна было на аглядах калядак, якія праходзілі 14, 19 і 26 студзеня ў Доме культуры. Былі гэта „Гайнаўскія...", а пасля „Павятовыя..." і „Ваяводскія сустрэчы калядных калектываў". Як ужо на самым пачатку заяўлялі арганізатары, сустрэчы мелі паказаць перад усім „культурнае багацце і разнароднасць Падляшша". З разнароднасцю на першых этапах аглядаў было даволі цяжка, бо, што крыху ўразіла, выступіў толькі адзін польскі, каталіцкі калектыў — дзеці са схолі „Пэрэлкі". Ніхто не казаў, што „Гайнаўскія сустрэчы" гэта праваслаўнае мерапрыемства, але такое магло скласціся ўражанне гледзячы на тое, што прысутнічала на ім некалькі дзесяткаў праваслаўных святароў, а нават сам мітрапаліт Сава. Тым часам на ваяводскім аглядзе менш было ўжо святароў, але затое разнароднасць была большая. Выступалі ўсе — ад дзяцей да старэчаў, ад нашых славутых „Арэшкаў" з Арэшкава, праз фальклорны калектыў з „культурнага памежжа польска-чарнарускага" (размаўляюць як мы, а спяваюць па-польску), да групы ў гуральскіх строях. Адкуль на Падляшшы гуралі, таго і не ведаю, і ведаць не хачу. Хопіць, што сведчаць яны пра „культурную разнароднасць нашага рэгіёна".

Астаецца яшчэ справа мовы, на якой вяліся мерапрыемствы. Так атрымалася, што гэта мы з Паўлам Валкавыцкім паведамлялі слухачам хто будзе выступаць і што праспявае. Прызнаюся, што падыход арганізатараў да мовы, на якой мелі весціся канцэрты, здзівіў мяне. Была я ўпэўнена, што калі адным з арганізатараў з'яўляецца БГКТ, а да ролі канферансье бяруць вучняў белліцэя, чакаюць ад іх ведання беларускай мовы. Што ж. Першы агляд прыйшлося павесці крыху па-польску, крыху па-свойму, крыху па-беларуску. То табе не белліцэй, Зося, тут не мусіш размаўляць па-беларуску. Будзеш доказам на разнароднасць!

Чалавек, якога перад чарговым аглядам я спытала: „Ці па-польску, па-свойму, па-беларуску?", з недаўменнем адказаў: „Ясная справа, што па-польску!" Каляднікі спяваюць па-свойму, па-беларуску, па-ўкраінску, па-руску, дык няхай прынамсі канферансье карыстаецца польскай мовай. Роўна і справядліва. І, што важнае — разнародна.

Мяне захапляе разнароднасць, багацце. Але тое, што да мяне сапраўды прамаўляе, гэта МАЁ. Мая традыцыя. Мая мова. Нават „Ажэшкі" з роднай вёскі майго дзядулі. І перад усім маё добрае, старое, памятанае яшчэ з дзяцінства „Рожджэство Хрыстово".

Зося Лемеш

Канкурэнцыя не дрэмле

Радная Чаромхаўскай гміны з вёскі Чаромхі падала заяву абмежаваць хуткасць аўтамабіляў на скрыжаванні дарог Кляшчэлі — Чаромха-Станцыя — Полаўцы (пагранічны пераход). Неафіцыйна гаворыцца, што гэта перашкодзіць патэнцыйным кліентам з-за мяжы рабіць пакупкі ў крамах Л. Селяха і сувальскага „Курчака". Паспрабаваў я высветліць справу ў Гміннай управе. Кіраўнічка сектара сельскагаспадарчай службы і аховы асяроддзя, у кампетэнцыі якой знаходзяцца дарожныя справы, сказала:

— Гэта лагічная прапанова і адпаведна абгрунтаваная. Зараз шафёры не прытрымліваюцца правіл дарожнага руху. Едучы з боку дзяржаўнай мяжы ў напрамку Кляшчэляў не збаўляюць хуткасці перад скрыжаваннем, бо знаходзяцца на дарозе з першынствам праезду. Шафёры, якія едуць у адваротным напрамку заязджаюць пад крамы нягледзячы на тое, што на дарозе працяглая лінія, якая забараняе паварочваць убок.

— Дык адкуль ім заязджаць? — пытаю.

— Ад тратуара, з боку Чаромхі, назначаны ўезд на пляцоўку, — паясняе Хрысціна Мішчук. — Уладальнік крамы абавязаны арганізаваць стаянку для аўтамабіляў. Такога месца не вызначылі. Паліцэйскі штрафаваў бы, каб бачыў такія парушэнні. Скрыжаваннем гэтым карыстаюцца дзеці, калі ідуць са школы і пешаходы, якія ідуць у краму. Малая няўвага і дарожная аварыя гатовая. Таму, на маю думку, рэакцыя раднай слушная. Мы не з'яўляемся ўладальнікам дарогі, таму не маем права ставіць ніякіх дарожных знакаў, — працягвае Х. Мішчук. — Справу перадалі мы ў Праўленне публічных дарог у Бельску-Падляшскім. Якое будзе рашэнне, цяжка сказаць. Два разы збіралася камісія ў вёсцы Чаромсе. Не рашылі нічога, але гэта па працэдурных прычынах. За апошнім разам не ставіўся прадстаўнік Павятовай камендатуры паліцыі. Арганізатары сустрэчы памылкова не паслалі запрашэння.

Аргументацыя раднай і Гміны, мабыць, і слушная, але мяне не пераканала. Больш схіляюся да неафіцыйных чутак чарамшан. А тыя кажуць, што за тым стаяць мясцовыя купцы, прыбытак якіх намнога паменшыўся з таго часу, як сувальскае птушынае прадпрыемства адкрыла сваю краму. Там цэны намнога ніжэйшыя і крама працуе кругласутачна. Калі туды не заеду, дык бачу шмат пакупнікоў.

— Паставяць аўтамабілям знак стоп, — сказаў знаёмы чарамшук. — Мае быць роў, які адгародзіць дарогу ад крамы. Усё гэта робіцца дзеля таго, каб адцягнуць пакупнікоў ад „Курчака".

Гандляры і купцы не перабіраюць у сродках супраць канкурэнцыі. Таму логіку знаёмага чарамшука лічу больш верагоднай.

Уладзімір Сідарук

У Новым Ляўкове

Новы солтыс і новыя накірункі дзеяння

Вечарам 24 студзеня ў Пачатковую школу ў Старым Ляўкове прыйшло 78 жыхароў вёскі Новае Ляўкова — на выбары солтыса і салэцкай рады. Сяло зараз налічвае 264 жыхары, а яго солтысам быў Ян Стоцкі. Паўнамоцтвы солтыса закончыліся і жыхары вылучылі пяць кандыдатаў на гэты пост. У першым туры галасавання Ян Стоцкі і Мікалай Лаўрашук атрымалі па 25 галасоў. У другім туры значную перавагу над сваім сапернікам атрымаў Мікалай Лаўрашук — аддалі на яго 40 галасоў.

У склад новаляўкоўскай салэцкай рады аднагалосна былі выбраны: Мікалай Лаўрашук, Ян Стоцкі, Лявон Максімюк, Марыя Целушэцкая і Альжбета Сахарчук. Рада і солтыс будуць сачыць за ходам работ пры пабудове санітарнай каналізацыі ў цэнтры вёскі, а таксама водаправоднай лініі да хутароў. У вёсцы патрэбны тратуар, хаця б на адным баку вуліцы. Дагэтуль праклалі яго тут няшмат. Неабходна адрамантаваць пачакальню на мясцовым аўтобусным прыпынку ПКС (пабіты ў ёй і дзверы, і вокны). Трэба рабіць намаганні, між іншым, дзеля таго, каб Тэлекамунікацыйны раён у Гайнаўцы абмяняў няўдачлівы вулічны тэлефон-аўтамат у Новым Ляўкове (псуецца 2-3 разы ў тыдзень).

У той выбарчы вечар сяляне шмат аб чым дыскутавалі ды разважалі. На іх пытанні адказвалі кіраўнік гайнаўскага Павятовага бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі (АРіМР), прадстаўнік Дарадчага асяродка сельскай гаспадаркі (ОДР) у Гайнаўцы ды сакратар Гміннай управы ў Нараўцы. Апошні з іх расказаў між іншым пра новыя інвестыцыі на тэрыторыі Нараўчанскай гміны.

Можа новы солтыс будзе ладзіць больш вясковых сходаў? Сяляне з Ляўкова хочуць больш ведаць, што іх чакае, калі Польшча далучыцца да Еўрасаюза. Прадстаўнікі АРіМР ды ОДР прапанавалі арганізаваць спецыяльныя курсы і абучэнне. Абяцалі таксама ва ўсім дапамагчы. Дарэчы, зараз у зімні перыяд у сялян на гэта хапіла б часу.

(яц)

Край-рай

Аўторак, 28 студзеня. Дабіраюся з Саколкі ў Беласток, выбіраю поезд. Падыходжу да тамашняга вакзала — сярод белага дня на вакзальным будынку зіхацяць ліхтары. Заходжу ўсярэдзіну — на сценах прызнанні і рэфлексіі тамашняй моладзі, нашай будучыні. У касе малады мужчына купляе білет; едзе недзе „ў Польшчу" — у Варшаве будзе мець 18 мінут запасу для перасадкі ў іншы поезд. Поезд, з Сувалкаў у Беласток пасажырскі, ад Беластока ў Варшаву скоры, прыязджае ў Саколку і ад'язджае адтуль пунктуальна, у 13.23; у Беластоку мае быць у 13.55. Едзем, значыць не толькі я ў Беласток, але і іншыя пасажыры хто-куды: колькі іх і з якім запасам часу ды на які транспарт будзе перасядаць у Варшаве ці на нейкай іншай станцыі — не ведаю. На прыпынку ў Васількаве поезд прастойвае паўгадзіны; з такім спазненнем прыязджае і ў Беласток. У Васількаве ён стаяў і чакаў, аж з'едзе ад Беластока — мабыць спознены — поезд з Варшавы ў Сувалкі, каб з ім мінуцца. На праезд між Васількавам і Беластокам поезд патрабуе пяць мінут і ён з вялікім запасам успеў бы прыехаць на размінанне ў Беласток, пунктуальна. Нейкі чыгуначны дыспетчар вырашыў аднак спазніць яго, на паўгадзіны. І ўжо той мой папярэднік з-пад білетнай касы не ўспее ў Варшаве на перасадку. Калі ён меў куплены чыгуначны білет, яму мо чыгунка верне нейкія грошы за яго. А за іншыя ягоныя страты? Але пасажыраў ехала больш; мо каторыя з іх мелі білеты на, напрыклад, самалёт. І не ўспелі, бо мо да Варшавы чарговыя дыспетчары нагналі поезду яшчэ большае спазненне. І хто б цяпер расплачваўся за іх страту, за прыкладны авіябілет? Сумняваюся амаль з упэўненасцю, што зрабіла б гэта наша чыгунка. І напэўна ніхто не адлічыў бы тае страты халатнаму нашаму дыспетчару, але магу з упэўненасцю меркаваць, што пры нагодзе нейкага свята нейкі іншы дабрадзей гаварыў бы пра яго працоўную ахвярнасць і грамадскую добрасумленнасць.

Чытаю ўспамін пра аднаго чыноўніка, што ён вельмі заслужаны, бо рашуча прычыніўся да пабудовы розных збудаванняў і там-сям назойліва хацеў памагаць. Але ж, з другога боку, ведаю, што тае дапамогі людзі не патрабавалі, а з тымі ягонымі збудаваннямі сёння невядома што зрабіць; мо найлепш было б, каб яны зусім праваліліся... Герку, які за чужыя грошы ўзваліў на краіну такі цяжар, якога яна не змагла вытрымаць, і невядома, што цяпер з усім тым рабіць, сёння дзе-хто прапануе стаўляць помнікі.

Тут, у Беластоку, праславіўся быў адзін дырэктар мясцовай касы хворых, якога паліцыя запыніла за кіраванне самаходам у п'яным відзе; з пункту гледжання сённяшняга нашага заканадаўства гэта злачынства. Але ж перад законам ён аказаўся законна невіноўным, бо алкамер, якім карысталася паліцыя, не меў атэстацыі. І я зноў упэўнены, што за куплю паліцыі ліпавых прыладаў і за патрачаны за імі час паліцыянтаў з ніводнага начальніка не спагналі ні граша. І таксама магу спадзявацца, што той чын атрымаў яшчэ за тое новаўвядзенне нейкую начальніцкую прэмію...

Калі выбіралі згаданага беластоцкага дырэктара на пасаду, чыноўнікі ў тутэйшай касе хворых не маглі далічыцца, колькі дакладна кандыдатаў балаціруецца. Але з новым дырэктарам рашылі яны папоўніць адукацыю. І сталі штудзіраваць... А за чые грошы? Вядома, што не за свае.

Зайшла гаворка пра платную адукацыю. Прыватныя вучэльні вабяць да сябе атэстатамі, адсутнасцю ўступных экзаменаў і наяўнасцю карыфеяў навукі. Адзін такі карыфей, які ў іншым увасабленні з'яўляецца старшынёй парламенцкага клуба адной з найбольш вядомых партый, прываблівае сваім прозвішчам і званнем у амаль дзесяць платных вучэльняў. А ў сапраўднасці заняткі вядуць там людзі без высокіх званняў. Бывае, што нейкая такая маладая, несхітраная яшчэ, асоба паставіцца да тых студэнтаў паводле іх заслуг і адмоўна ацэніць іх веды. Тады такую асобу кліча (ды)рэктар і нагадвае, што студэнты плацяць грошы і іх трэба ацэньваць станоўча. Раней усялякія атэстаты можна было нелегальна купіць у гандляроў на базары. Сёння такія дзялкі перайшлі ў кабінеты з сакратаркамі, камп'ютэрамі і легальнымі банкаўскімі рахункамі. І далей абменьваюць ліпавыя атэстатныя паперы на сапраўдныя нацбанкаўскія.

Ці варта далей пералічваць падобныя з'явы гульняў за чужыя грошы? *Всей водки не перепьёшь* — гавораць у Расіі. А ў нас — як за караля Саса: гуляй душа, пекла няма!

Пару гадоў назад адзін мой знаёмы прыслаў мне заклік стварыць новую, сваю, партыю, якая змагалася б за ўсё станоўчае. Я нават не адгукнуўся яму: бо ці ж існуе ў нас каторая партыя, якая змагалася б за адмоўнае?

Аляксандр Вярбіцкі

Вачыма паляка

Памяркоўны адвакат

У апошні час праз Сейм пракацілася дэбата наконт польскай замежнай палітыкі найбліжэйшага часу. І наколькі ў кантэксце здарэнняў у свеце мала сумніваў, могуць выклікаць яе два галоўныя прыярытэты (уваход у структуры Еўрасаюза і асабліва блізкае партнёртва з ЗША), дык трэці з іх: адкрыццё Польшчы на Усход — за сабою цягне шмат пытанняў. Як у выказваннях шэфа польскай дыпламатыі Владзімежа Цімашэвіча, так і ў пераважнай большасці паслоў кіруючай кааліцыі і апазіцыі вынікала, што зараз за ўсходняй мяжой павінны мы шукаць сабе партнёра ў наступным парадку: у Літве і Украіне, у Расіі, а наканец у Беларусі, не забываючы і аб іншых былых рэспубліках СССР, як Казахстан, галоўным чынам з прычыны пражываючай там Палёніі. Нават вядомы з экстравагантных выказванняў і паводзін беспартыйны пасол Габрыель Яноўскі пагадзіўся са сцвярджэннем, што Еўропа, незалежна ад таварыскіх і саюзных суадносін, не будзе канчацца на Бугу. Заклікаў да наладжання спецыяльных суадносін з аднаго боку з Еўрасаюзам, з другога — з Расіяй, Украінай, а — як гэта ён акрэсліў — у будучыні з Беларуссю і з Турцыяй. Аднак у сеймавай дэбаце дамінавалі прасаюзныя галасы, якія падтрымліваюць усходнюю палітыку актуальнага ўрада. Шмат з прамоўцаў успаміналі Беларусь, але, наколькі я ўважліва выслухаў працяг дэбаты, з адносінамі да гэтай краіны былі яны вельмі асцярожныя.

— Еўропа абражваецца на недахоп дэмакратычных прынцыпаў у Беларусі. Ці Польшча, аднак, не павінна выйсці з шэрагу і звязацца з тамашнімі дэмакратычнымі сіламі? — пытаўся, здавалася б, рытарычна, Ежы Яскерня (СЛД).

Быццам у тым жа кантэксце выказаўся былы маршалак Сейма Мацей Плажынскі (Грамадзянская платформа):

— Памылкай было б легітымізаваць Аляксандра Лукашэнку. Не можам завельмі ласкава адносіцца да парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі.

— Беларусь гэта апошняя цалкам недэмакратычная ў Еўропе краіна. Мусім старацца за беларускую дэмакратыю і яе ўспамагаць. Гэта вельмі важны фактар нашых адносін з Усходам, — пераконваў у сваю чаргу Яраслаў Качынскі (Права і справядлівасць).

Пры нагодзе Тадэвуш Самборскі (ПСЛ) заўважыў:

— У Беларусі заўважаецца значны капітал сімпатыі да Польшчы.

Падляшскі пасол СЛД Яўген Чыквін спасылаецца на грамадскую думку, што палякі на першым месцы ў беларусаў у адносінах да іншых нацый. Прытым Я. Чыквін, як адзіны пасол, не спрабаваў папракаць у чым-небудзь Беларусь, асабліва гэтак, як іншыя паслы з пазіцыі вялікага брата ці, як акрэсліў Г. Яноўскі, сэрца Еўропы.

— Нашых адносін з Беларуссю не абцяжарваюць гістарычныя, трагічныя падзеі. Без зразумення Аляксандра Лукашэнкі і сітуацыі ў Беларусі нічога не даб'емся.

Аднак, суадносіны з Беларуссю ўва ўсёй сеймавай дэбаце былі сапхнуты на абочыну. Ніхто не заікнуўся нават, як павінны яны выглядаць, па-за выказваннямі збліжэння з г.зв. дэмакратычнай апазіцыяй. Хто канкрэтна з польскага боку меў бы з гэтай апазіцыяй збліжацца, ужо паслам праз горла не працінулася, бо ж цяжка ўявіць (прынамсі мне), каб прадстаўнікі польскага ўрада ці прэзідэнцкай канцылярыі дамаўляліся за плячыма Лукашэнкі, якога ўсё ж легітымізавалі, хоць неахвотна, у Еўропе і свеце. Дык тыя пастулаты, апроч дэкларатыўнасці, нічога не азначаюць. Не ўдасца Польшчы выйсці па-за еўрапейскі шэраг, а заклікі змагацца за дэмакратыю ў Беларусі ні на што не прыдадуцца, калі польскія цэнтры ўлады не ў змозе нават успамагчы Радыё „Рацыя".

Урэшце, з выказванняў міністра Цімашэвіча і пазней Аляксандра Кваснеўскага досыць ясна вынікае, што не бедная Беларусь, ані нават маленькая Літва, а багатая ў натуральныя рэсурсы і пакуль кульгавая, але, усё ж, імперыя — Расія — гэта партнёр, на якім будзе залежаць польскай палітычнай эліце. І нават калі прэзідэнт Кваснеўскі і сказаў, што польская спецыяльнасць — быць адвакатам у адносінах да ўсходніх краін, то ў гэтым кантэксце вылучыў, між іншым, Украіну. З Беларуссю польская замежная палітыка ўсё не можа справіцца, а, можа, і не хоча, бо, як у жыцці, часам лепш нічога не рабіць, каб не ляпнуць якога глупства з малапрыемнымі паслядоўнасцямі ў будучыні.

Беручы пад увагу сур'ёзныя разыходжанні ў законе, гаспадарках і эканамічных цягах абедзвюх нашых краін, застанецца толькі базарны памежны гандаль (нават калі ад лета будуць уведзены дарагія візы), ну, і, вядома, культурны абмен.

Мацей Халадоўскі

Праўда на баку пераможцаў

У 2 н-ры „Нівы" ад 12 студзеня г.г. друкаваўся допіс Васіля Петручука «„Героі" і „бандыты"». Праўду напісаў аўтар. Зараз у нас усё навыварат пайшло. Каты мірнага беларускага насельніцтва называюцца героямі, а тыя, што аддавалі жыццё за Айчыну, яе свабоду і незалежнасць асуджаюцца.

Пасля заняпаду камуны і прыходу да ўлады постсалідарніцкіх груповак наша палітыка прыняла іншы напрамак. Зараз на ўсходзе — злачынцы, на захадзе — героі.

На Блізкім Усходзе не ціхне вайна. Ізраіль разбурае гарады і вёскі палесцінцаў. Гінуць людзі. Дзеецца гэта на вачах усяго свету. А свет маўчыць...

Калі аль-Каіда зрабіла замах на Сусветны гандлёвы цэнтр у Нью-Йорку ў верасні 2001 года, пачуўся плач на ўсю планету (спачуваю сем'ям нявінна загінуўшых амерыканцаў). Па палесцінцах ніхто не плача, бо гэта людзі трэцяга свету.

Джордж Буш публічна аб'явіў акцыю супраць Ірака. Галосіць усяму свету, што Гусейн стварае пагрозу біялагічнай вайны. Рыхтуецца да агрэсіі, шукае саюзнікаў. Пакуль што, адна Вялікабрытанія стала на баку Амерыкі. Еўропа да справы ставіцца скептычна. Супраць вайны выказваюцца Нямеччына, Францыя і Расія. Толькі міністр Цімашэвіч заявіў, што нягледзячы на тое, ці міжнародны форум дазволіць Амерыцы і саюзнікам на вайну з Іракам ці не, Польшча стане на баку Амерыкі і можа, як спатрэбіцца, паслаць войска (раней, такі пункт гледжання выказаў прэзідэнт Кваснеўскі ў час візіту ў Амерыцы). Узбударажыла гэта многіх палітыкаў, як і звычайных грамадзян. Расхвалявала гэта мяне таксама. На маю думку партнёраў і саюзнікаў трэба нам у першую чаргу шукаць у Еўропе.

Уладзімір Сідарук

Бярысь, не разбярысь

Гісторыю можна разглядаць з розных бакоў і кожная ўлада выкарыстоўвае яе выключна для сваіх мэтаў. Я згодны са спадаром Васілём Петручуком, што колішнія бандыты сталі сёння „героямі", а героі — „бандытамі". Але і пры камуне ніхто нас не пытаўся, якая мае быць гісторыя і тым болей сёння ніхто нас не будзе пытаць. Адным вучням школ падаецца адну ману, іншым вучням — другую; і так круціцца кола гісторыі. Я згодны з адгалоскай «„Героі" і „бандыты"» з 2-га нумара „Нівы", бо ведаем, як узброеныя атрады AK-WiN і NSZ зараз пасля заканчэння другой сусветнай вайны „змагаліся" за свабодную Польшчу, як гарэлі нашы вёскі. Недалёка шукаючы — Залешаны, дзе „змагары" загналі людзей у хату і пасля яе падпалілі, а хто ўцякаў, дык стралялі ў іх. Але былі і такія, што стралялі не ў людзей, а ў паветра; значыць і сярод іх былі людзі са спагадай. Як ведаю, у Залешанах лясныя „змагары" шукалі ярага камуніста Дземянюка, але ён уцёк і бандыты з гэтай прычыны схапілі яго малалетняга сына і замардавалі. І праўду піша аўтар, што сённяшнія „бандыты" дзяржаўнай бяспекі легальнай улады, як і міліцыя, такіх злачынстваў не ўчынялі. Але каб не было сваіх здраднікаў, дык намнога менш было б такіх дзікіх распраў так з боку фашыстаў, як і з боку польскіх лясных „змагароў".

Я дзівуюся смеласці і адвазе сп. Петручука, бо калі яго ўжо на вуліцы Беластока балюча аддубасілі толькі за тое, што піша праўду аб „гераізме" розных Лупашкаў, а яшчэ пасля і пагражалі па тэлефоне, дык я на ягоным месцы мо і злякаўся б; хто ведае... Бо, як кажуць, свая кашуля бліжэй цела, а тым болей, што наша праўда і мужнасць толькі значыць, як адна кропля дажджу ў час гарачыні. Але калі б не было такіх смелых і адважных людзей сярод нас, дык мо даўно ўжо загінула б наша родная мова і свая гісторыя. Таму варта цаніць такіх людзей, што пішуць і гавораць праўду, нягледзячы на яе кошт.

Мікалай Панфілюк

Без „Астрона” і „Сэрцайкі” — ані руш

Як толькі рэабілітант Андрэйка Мушкатэль прывёз нам у бальніцу апошнія нумары „Нівы”, мае сяброўкі па палаце адразу ажывіліся і пачалі чытаць — адна перад другой — цікавейшыя артыкулы ўголас.

Валянціна Сушч беларускую мову вывучала старанна і таму так ахвотна ўзяла ў рукі „Ніву”. Яна жыве ў вёсцы Кошкі, што ў дзесяці кіламетрах ад Бельска. У падставовую школу яна хадзіла два кіламетры ў Пашкоўшчыну. Яшчэ тая школа стаіць, расказвае яна. Было там восем класаў, а сам будынак знаходзіўся пасярэдзіне поля. Унізе вучыліся дзеці, а наверсе жылі дзве сям’і настаўнікаў.

Пасля настаўнікі даязджалі дзесяць кіламетраў з Бельска, бо дзяцей было ўсё менш і парабілі спалучаныя класы. А потым дзеці з гэтай школы пачалі ездзіць аўтобусам у школу ў Малінніках. Цяпер ужо і там школы няма. Стаіць пусты мураваны будынак, а ўсіх дзяцей перавялі ў школу ў Орлю.

Будынак школы ў Пашкоўшчыне спачатку арандавалі. Там быў вясковы клуб, рабілі забавы, прадавалі „Ніву”, гаворыць Валянціна. Ну, чытаць і пісаць па-белаурску я не развучылася. Мне во каб „Сэрцайка” ў „Ніве” было, чом яго ліквідавалі? Я яго заўсёды чытала першае. Другі быў „Астрон”. Добра, што хоць ён застаўся, але чом не даеце „Сэрцайка”?

У Кошках засталіся лічаныя гаспадаркі. І муж Валянціны працуе ў Бельску, а ўся гаспадарка на яе галаве. Трынаццаць гектараў, дзевяць дойных кароў, шэсць бычкоў, нядаўна прыбылі яшчэ два. На жаль, муж мусіў змагацца з усім без жонкі, хаця дапамагаў цесць. Валя тады была ў бальніцы: пазваночнік напамінае аб сабе. Добра, што яна заўсёды можа разлічваць на бацькоў. Дачка закончыла беларускі ліцэй у Бельску і штудзіруе беларусістыку ў Беластоцкім універсітэце.

Гераніма Кадлубоўская жыве ў вёсцы Кярснова Браньскай гміны. Выйшла замуж „на шляхту”, але нарадзілася яна ў вёсцы Малыя Грыневічы. Калі ехаць з Беластока ў Бельск, дык за Храбаламі па шашы направа будуць Гацькі, а налева ў трох кіламетрах — Малыя Грыневічы. У Малых Грыневічах жывуць католікі, сцвярджае Гераніма, а ў Вялікіх Грыневічах — католікі і праваслаўныя.

Да Грыневіч меў дачыненне народаволец Ігнат Грынявіцкі, які 1 сакавіка 1881 года зрабіў замах на цара Аляксандра II і забіў яго, а сам быў смяртэльна паранены. Гераніма з дому таксама Грынявіцкая.

Малая Ромка хадзіла ў школу ў Гацьках. Калі было цёпла, дзеці хадзілі тры кіламетры пехатою, або ездзілі роварамі. Калі было холадна, дзяцей давозілі па чарзе фурманкамі. Хаця, як успамінае яна, „Ніву” ў школе чыталі праваслаўныя, то і яна чытала разам з імі, хаця наогул католікі не хадзілі на ўрокі беларускай мовы. Янку Купалу Гераніма памятае добра. З дзецьмі гаварылі па-рознаму: па-польску і па-беларуску. Пасля школу перавялі з Гацькоў у Храбалы, гэта было тады, калі ў Храбалах ліквідавалі гміну. Ах, з якой прыемнасцю ўзяла Рома ў рукі „Ніву”!

Фота АДЫ ЧАЧУГІ

Гераніма Кадлубоўская (злева) і Валянціна Сушч чытаюць „Ніву”

У Кярснове таксама гаспадарак засталося мала. Але Кадлубоўскія гаспадараць далей на пятнаццаці гектарах, а да таго яшчэ восем гектараў узялі ў арэнду. Маюць дванаццаць дойных кароў, маладняку — шэсць штук, ёсць парасяты, куры. Раней трымалі пяць коней, цяпер — толькі два.

Сёння машыны замянілі коней. Цэлым гаспадаром тут сёння сын Марцін, якому дваццаць чатыры гады і які мае сельскагаспадарчую адукацыю. Бацькі перапісалі гаспадарку на яго, але працуюць усе, хто застаўся на гаспадарцы. Старэйшы сын працуе ў Беластоку, а дачка выйшла замуж у суседнюю вёску. Наймалодшаму сыну Тадзіку сёлета споўнілася васемнаццаць гадоў. Ён ужо ездзіць трактарам „Zetor” і рвецца, каб кіраваць машынай, але пакуль што распараджаецца ёю старэйшы брат Марцін.

Зямля тут добрая, дарагая. Бацькоўскія гектары, якія атрымала Гераніма ў Малых Грыневічах, на жаль, разы ў тры таннейшыя. Але міла ёй там. Калі на Каляды паехалі да маці ў Малыя Грыневічы, дык мо дзесяць разоў калядзілі — з гвяздамі прыходзілі. У нас з гвяздамі не ходзяць, гаворыць з жалем Гераніма, у нас ходзяць толькі з шопкай...

Ага, хлеб Ромця пячэ заўсёды сама. Штотыдзень!

Ада Чачуга

Да 110-годдзя з дня нараджэння Канстанцыі Буйло

Еднасць з роднай зямлёй

Я хацела б прарасці сасной,
Хай бы ветры пелі нада мной.
Пры жыцці любіла я сасну,
Як сястру душы маёй прачулай.
І калі навекі я засну,
Я хачу, каб кожную вясну
Спеў жывы я на світанку чула.

К. Буйло

Пажаданне гэтае, напісанае задоўга да смерці, збылося. Пражыўшы 63 гады ў Маскве (1923-1986) і памершы там, яна была пахавана ў вёсцы Вішнева Валожынскага раёна. Над магілай шумяць сосны, нагадваючы нашчадкам аб складаным і гаротным жыцці знакамітай беларускі.

Тут, у Вішневе, некалі жылі бацькі. Тут адбылося знаёмства з Уладкай Станкевічанкай (будучай жонкай Купалы). Уладзіслава Францаўна, працуючы настаўніцай у Вільні, часта прыязджала да бацькоў у Вішнева. Канстанцыя Антонаўна прыходзіла да Эміліі Юльеўны Станкевіч браць урокі французскай мовы. У час аднаго з іх і адбылося знаёмства дзяўчат, якое перарасло ў вялікую дружбу на доўгія гады. Яны сталі неразлучныя: разам жылі ў Вільні (1914 год), разам бывалі ў бібліятэках, чытальных залах, у кнігарнях, выдавецтвах, на вечарах, у кавярні, дзе часта збіралася творчая моладзь.

Нарадзілася Канстанцыя Антонаўна 14 студзеня 1893 года ў Вільні ў сялянскай сям’і. Бацька, Антон Аляксандравіч, працаваў на розных работах, бо ўмеў усё: быў старшым конюхам у скакавых канюшнях князя Гагарына, аб’ездчыкам у графа Тышкевіча, даглядаў разарый, займаўся паляваннем, умеў вырабляць чучалы птушак і звяроў, майстраваў музычныя інструменты. Нават стварыў сямейны струнны аркестр (у сям’і было сямёра дзяцей), разводзіў пчол, рабіў мэблю. У вольныя ад работы хвіліны чытаў газету „Наша ніва”, якую выпісваў для сябе, дзеці атрымлівалі часопіс, а таксама кнігі Міцкевіча, Купалы, Коласа, Багушэвіча, Тараса Шаўчэнкі, што час ад часу купляліся.

1909 год стаў лёсавызначальным для Канстанцыі Антонаўны. Газета „Наша ніва” друкуе яе верш „Хвоя”. У знак сімпатыі да аўтаркі Я. Купала ў 1910 годзе на сваім вершы „Мая думка” напісаў: „Прысвячаю Канстанцыі Буйло”.

У адказ атрымаў „Звон” з прысвячэннем. Завязалася перапіска, вынікам яе стаў адрэдагаваны Я. Купалам зборнік „Курганная кветка”, які ўбачыў свет у 1914 годзе. У гэты ж час былі напісаны п’есы „Кветка папараці” і „Сягоняшнія і даўнейшыя”. Літаратурная праца садзейнічала паспяховай вучобе на кароткатэрміновых курсах настаўнікаў у Вільні. Тут пасябравала з Уладкай Станкевічанкай, захаваўшы цёплыя адносіны з ёю на ўсё жыццё.

Працоўны шлях Канстанцыі Антонаўны пачаўся на Лідчыне, дзе яна настаўнічала, потым (1915-1916) загадвала беларускай кнігарняй у Полацку. Тут сустрэла свайго суджанага, выйшла замуж і амаль адразу маладыя пераехалі ў Расію. Там пачаліся яе бадзянні па розных установах у пошуках заробку: працуе статыстам у Валакаламскім павятовым выканкаме рабочых і сялянскіх дэпутатаў, бухгалтарам саўгаса „Данілкава”, а пасля пераезду ў 1923 годзе ў Маскву — на заводзе „Аграном” (1929-1934), начальнікам аддзела збыту політэхлабсаюза (1934-1940), начальнікам аператыўнага аддзела, выконвала абавязкі намесніка дырэктара цэнтральнай канторы ветэрынарнага забеспячэння трэста Саюзветзабпрам.

Адыход яе ад паэзіі вельмі непакоіў Купалу. Бываючы неаднойчы ў Маскве, ён пастаянна гаварыў: „Хопіць вітаць у аблоках”. У хуткім часе жыццё прымусіла апусціцца на грэшную зямлю. У 1933 годзе быў беспадстаўна рэпрэсіраваны муж, Калечыц Віталій Адольфавіч, а яна стала жонкай „ворага народа”. Свой невычэрпны боль пераносіла ў вершы, якія ішлі лавінай. Але яна іх тут жа ператварала ў попел. Сярод старых рукапісаў выпадкова захавалася некалькі вершаў 1937-38 гадоў, якія даюць падставу разважаць аб душэўным стане паэтэсы, амаль зломленай жыццём („А жыццё за горла брала дома”).

Толькі ў 1957 годзе яна змагла, з палёгкай уздыхнуўшы, напісаць сястры Іне: „У меня большое, очень взволновавшее меня событие. Собравшись с духом, я недавно позвонила следователю Мальцеву, ведшему дело о Виталии. И представь моё волнение, когда он сообщил мне, что 29 июля, в понедельник, дело разбиралось в Моск. Гор. Суде, и суд вынес Виталию полное оправдание... Я целый день проплакала и от радости, и от горя. Двадцать пять лет несли мы бремя этого незаслуженного позора. Три раза снимали с работы меня, три раза Женю” (сына — Т. Л.).

Ратавала і тое, што пасля пераезду ў Маскву Канстанцыя забрала бліжэй да сябе рэшткі сваёй некалі вялікай сям’і — маму Настассю Францаўну, сястру Іну (Міхаліну) і брата Вітальда. Астатнія знайшлі свой спачын на радзіме.

У часы вайны 1941-1945 гг. застаючыся ў Маскве, Костка Буйлянка (так яе называлі сябры) часта сустракалася з беларускімі пісьменнікамі, воляю лёсу закінутымі ў сталіцу: Кузьма Чорны, Максім Лужанін, Пімен Панчанка, Пятро Глебка, Міхась Лынькоў і іншыя. У 1944 годзе яна стала членам Саюза пісьменнікаў. Пасля вайны шмат піша, аб чым сведчаць зборнікі вершаў: „Світанне” (1950), „На адноўленай зямлі” (1961), „Май” (1965), „Роднаму краю” (1973).

Сапраўдным святам душы стаў выдадзены ў 1981 годзе двухтомнік выбраных твораў, сярод якіх — паэма „Па траскіх гацях” — шчыры аповед аб кожным са сваіх сямейнікаў.

Выйшлі зборнікі вершаў для дзяцей: „Юрачка” (1957), „У бляску зор” (1968), „Вясной” (1984).

Многія з вершаў Канстанцыі Буйло пакладзены на музыку, але самы знакаміты, канешне ж, „Люблю наш край, старонку гэту”. Па словах Сяргея Грахоўскага, яго будуць спяваць датуль, пакуль на свеце будзе жыць хоць адзін беларус.

Тамара Лаўрэнчук, г. Высокае

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Генерал без вінтоўкі

Настаўнік сварыць: — Вельмі брыдка,
Прыйшоў без даўгапісу, сшытка.
І як жа ты, няўдалы Лёўка,
Будзеш цяпер пісаць дыктоўку?

Як зваць салдата, скажы мне,
Што без вінтоўкі на вайне?
Суседка Воўку падказала:
— Завуць такога генералам.

Бабу прынёс д'ябал

Сваёй бабулі ўнучак Жэня
Улез звычайна на калені.
Просіць бабуленька малога:
— Сыдзі з кален, баляць мне ногі.

Сыдзі, унучак, мой прыгожы,
Я змучаная падарожжам.
А тата кажа: — Нашу бабу
Ізноў прынёс дахаты д'ябал.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Малодшыя вучні паказалі пастаноўку аб Хрыстовым нараджэнні

Ёлка ў Чыжах

Ёлка ў Комплексе школ у Чыжах арганізуецца здаўна, але сёлета вучні падрыхтавалі больш цікавыя, чым у мінулых гадах выступленні. У мерапрыемстве, якое ладзілася 25 студзеня, прынялі ўдзел войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк, бацькі і сваякі вучняў.

Спачатку дырэктар школы Міраслаў Пяткевіч прывітаў сабраных, а дзеткі з Пачатковай школы станцавалі „Паланез". Затым выступілі прыгожа апранутыя дашкольнікі з пастаноўкай і песнямі. Вучні наймалодшых класаў паказалі на сцэне сучасныя танцы і дэкламавалі польскія і беларускія вершыкі. Друга- і трэцякласнікі выступілі ў некалькіх пастаноўках і ледзь паспявалі пераапранацца.

Гімназісткі, якія вялі мерапрыемства, разам з сяброўкамі з калектыву „Гама" праспявалі калядкі і свецкія песні. З калядкамі выступалі яны на Павятовых сустрэчах калядных калектываў у Гайнаўцы. А на Гайнаўскіх спатканнях з праваслаўнай калядкай занялі другое месца. Выступленні закончыліся пастаноўкай аб Хрыстовым нараджэнні. Вучні з малодшых класаў Пачатковай школы паказалі сцэнку пакланення Хрысту вешчуноў і пастушкоў. Дзеткі адважна і ўмела выступалі на сцэне і ўзнагароджваліся гарачымі апладысментамі. Выклікалі яны Святога Мікалая, які разам з памочнікам раздаваў наймалодшым вучням падарункі. Каб атрымаць ласункі, вучням трэба было дэкламаваць вершы або спяваць песні.

Пасля супольнай урачыстасці вучні разышліся па сваіх класах на пачастунак. У спатканнях з наймалодшымі вучнямі прымалі ўдзел бацькі. За святочнымі сталамі вучні размаўлялі пра школьныя справы і спявалі песні. Супольныя гульні і танцы ў актавай зале цягнуліся да вечара.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Наймалодшыя вучні выступілі ў прыгожых касцюмах

Дзённік Міколы

Люты бар

Пасля кіно нам не хацелася вяртацца дахаты.

— Пані Клемянціна запрашала нас на марожанае, — успомніла Аня. Прапанова ўсім спадабалася.

Я яшчэ не расказаў вам пра бар спадарыні Клемянціны Арлоў. У нашым горадзе няма больш такіх бараў, наш завецца „Маліна". Бар „Маліна" знаходзіцца насупраць нашай камяніцы. Там можна атрымаць марожанае, сок і піцу. Мы ўсе, г.зн. Аня, Тамаш і Ярак, часта заходзім у „Маліну". Папраўдзе, там сустракаюць нас нечаканыя і непрадбачаныя сцэны. Сёння мы ішлі туды і думалі, што ўбачым гэтым разам.

Спадарыня Клемянціна была тоўстая і высокая бландзінка. Яна або смяялася, або плакала.

— А які смак марожанага найлепшы? — запытаў Мілаш.

— Вядома, малінавы, — гукнулі мы хорам. Я думаў пра іншае. Якая прыгода сустрэне нас сёння ў „Маліне"?

Мы падняліся высокімі ўсходамі і праз момант былі ў бары. І што там пабачылі?

Перад нашымі вачыма разыгралася здарэнне нібы з амерыканскага фільма-баевіка. Пасярэдзіне „Маліны" стаяў барадач з аўтаматам. Спадарыня Клемянціна была прывязана вяроўкай да століка. Усе іншыя госці былі таксама павязаны.

— Развяжыце, калі ласка, паню Клемянціну, — папрасіла ласкава Аня барадатага. — Мы хочам, каб нашы новыя сябры пакаштавалі марожанае. Яны нетутэйшыя.

— Ха-ха-ха! — загудзеў тэрарыст. — Ха-ха-ха!

Ён узяў яшчэ адну вяроўку і павязаў усіх нас: мяне, Марту, Мілаша, Максіма, Міхася, Тамаша і Ярка.

— А ты, калі такая добрая, — загадаў Ані, — падрыхтуй усім вязням марожанае!

Нашы новыя сябры напалохаліся. Праз момант усе маўчалі... аж пачалі смяяцца і злачынца таксама. Пасля людзі пачалі скідаць з сабе вяроўкі.

Трэба вам ведаць, што ў бары пані Клемянціны па суботах працаваў тэатр. У ім выступалі жыхары нашага квартала. Тут выступалі нашы бацькі, Яркава бабуля Ярка і Анін дзядзка. І цяпер, калі мы сюды зайшлі, адбывалася рэпетыцыя п'есы „Люты бар". Сцэнічнае афармленне для тэатру рыхтаваў Нор Узі.

— Чаму яны падабралі такі баявіты сцэнарый? — спытала Марта.

— Бо хочам быць „на хвалі", — адказаў аўтар „Лютага бару". Быў ім вядомы вам настаўнік Вожык. Ён адыгрываў галоўную ролю — вязаў усіх вяроўкай.

Нам падумалася, што ў „Маліне" рыхтуюць канкурэнцыю Галівуду.

(працяг будзе)

(нак-с)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выступае тэатральны гурток

Пішуць вучні

У кожнага свае зацікаўленні

На ўроках беларускай мовы сустракаюцца IV „а” клас (дванаццаць вучняў) і V „ц” (тры вучаніцы). Мы вельмі любім урокі беларускай мовы. На гэтых занятках вучымся чытаць і пісаць, вывучаем граматыку і вершы. Нашай настаўніцай — Аліна Ваўранюк. Яна вядзе таксама тэатральны гурток. На пытанне, як яна прыдумала заняткі ў тэатральным гуртку, адказвае:

— Мне заўсёды падабаўся тэатр. Таму я дайшла да высновы, што ў нашай школе трэба весці тэатральныя заняткі.

Гутарым з вучаніцамі V „ц” класа:

— Дзе вы сталі вывучаць беларускую мову?

— Мы пачалі вывучаць беларускую мову ў Прадшколлі н-р 14 і мы шчаслівыя, што можам далей гэтым займацца.

— А што найбольш вам падабаецца ў школе?

— Тэатральны гурток „Гульня ў тэатр”.

— Дзякуем за размову.

Оля Каліна, Эмілька Мусько, Мацек Карчэўскі

У нашым класе 27 вучняў. На ўроках беларускай мовы ходзіць 12 вучняў і 3 асобы з V класа. Часам на ўроках маем пластычныя заняткі і вельмі часта працуем у групах. Вельмі любім беларускую мову. Пані Аліна гаворыць, што вучні, якія вучацца беларускай мове гэта найлепшыя вучні ў класе. Амаль усе маюць пяцёркі і шасцёркі.

Аляксандр Ваўранюк, Марыюш Врублеўскі, Алесь Мазурук

У нашым класе 27 вучняў, 12 з іх ходзіць на беларускую мову. Кожны вучыцца вельмі добра. Нам падабаюцца ўрокі роднай мовы і заняткі тэатральнага гуртка, якія вядзе наша настаўніца Аліна Ваўранюк. Падабаюцца нам таксама заняткі нямецкай і англійскай моў.

Оля Більмін, Юліта Жамойда, Оля Паўлючук

Калі б хтосьці наведаў Пачатковую школу н-р 4 у Беластоку, напэўна пачуў бы настаўнікаў, якія наракаюць на нейкі клас. Калі б вы іх спыталі, пра які клас гавораць, дык яны сказалі б, што пра наш IV „а”. У нашым класе вучацца розныя дзеці, такія што „дурэюць”, такія што іграюць на інструментах, і такія што вывучаюць беларускую мову. Нас усіх 27 і ў кожнага свае зацікаўленні, таму можам гуляць у тэатр, у якім патрэбныя акцёры, музыкі і пластыкі. Настаўніца беларускай мовы гаворыць пра нас, што мы своеасаблівыя.

У нашай школе дзеці вучацца беларускай мове з першага па шосты клас. У нашым класе на заняткі ходзяць 5 хлопцаў і 7 дзяўчат. Дзяўчаты кажуць, што нашы хлопцы няўважлівыя, але добра сябе паводзяць. Хлопцы кажуць, што некаторыя дзяўчаты файныя, але ёсць і „паскуды”. Мы думаеш, што наш клас вясёлы і з гумарам.

Кася Юшчук, Наталька Кандрацюк-Свярубская, Матфей Севаст'янік

* * *

Эміль! Ён гультай, лянота,
У яго дурэць ахвота.
Наша першая Оля скача,
А другая Оля плача.
Яны разам усё гуляюць
І нас у гульню запрашаюць.
Магда сморкае за двое,
Аня вучыцца за трое.
Паўліна зубы вялікія мае,
Тымі зубамі ўсіх кусае.
Паўля замест спакойна стаяць
Ідзе ў склепік цукеркі купляць.
Кася смяецца, за ўсіх гуляе,
Адам і Мішка дапамагаюць.
Агата прыроду ў носе мае,
Сільвія ў ім калупае.
Каміля з Паўляй усё гавораць,
Кшысек смяецца і сваволіць.
Патрыцыя сваёй красой занята,
Каміля побач стаіць заўзята.
Малышка ў школе плюсы збірае,
Марцін як малпа, толькі гуляе.
Марта думаць заўджы гатова,
Караліна бегае многа.
Ася надта добра спявае
Ёй Юстына дапамагае!
Патрык акуляры мае,
Караль як дурань выглядае.

Оля Максімюк, Магда Саковіч, Аня Яканюк

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Кастусь Каліноўскі

Юнацтва героя

Кастусь Каліноўскі нарадзіўся 2 лютага 1838 года ў вёсцы Мастаўляны недалёка ад Горадні (цяпер гэтая вёска знаходзіцца ў Польшчы) у сям'і беларускага шляхціча. Спачатку будучы герой вучыўся ў хатняга настаўніка-„дарэктара”, а потым у павятовай навучальні ў мястэчку Свіслач.

Кастусь вельмі сябраваў са сваім старэйшым братам Віктарам. Той быў студэнтам Маскоўскага універсітэта, добра ведаў гісторыю, якую вывучаў па старадаўніх рукапісах і кнігах. Ад брата Кастусь шмат даведаўся пра слаўнае мінулае Беларусі, пра тыя часы, калі наша зямля была свабодная. Кастусь ненавідзеў царскую ўладу і прыгоннае права, што трымала ў няволі сялянаў.

Пасля навучальні Каліноўскі паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. З Масквы ў Пецярбург у гэтым часе пераехаў і брат Віктар. Разам з сябрамі Кастусь і Віктар стварылі падпольны гурток. Яны марылі пра вызваленне Бацькаўшчыны і рыхтаваліся да будучай барацьбы. Кастусь пакляўся прысвяціць гэтай справе ўсё сваё жыццё.

Скончыўшы універсітэт, ён вярнуўся ў родныя мясціны і пачаў дзейнічаць. У Горадні Кастусь заснаваў таемную рэвалюцыйную арганізацыю. Разам з таварышамі ён нястомна ездзіў па наваколлі і рыхтаваў людзей да паўстання.

(працяг будзе)

Навучыць талерантнасці

У пятніцу 3 студзеня I „д” і III „ц” класы Гімназіі з бельскай „тройкі” з выхавацелькамі Альжбетай Навацкай і Валянцінай Бабулевіч пайшлі на бельскія могілкі да помніка вазакам. Дарога на могілкі была даволі цяжкай, бо якраз таяў снег і ўсюды было поўна вады. Мы, аднак, рашылі ісці, каб перад Калядамі занесці свечкі і святочныя ялінкі на гэту магілу. На месцы настаўніца беларускай мовы расказала нам пра трагічную смерць нявінных людзей, якія загінулі з рук атрада „Бурага”. Мы даведаліся таксама якім чынам паўставаў гэты помнік і гэтая магіла. Хвілінай цішыні ўшанавалі мы памяць загінуўшых. Пасля я доўга думала аб трагічнай гісторыі нашых зямель і зразумела, што каб такое ніколі больш не паўтарылася, трэба навучыць людзей шанаваць іншых, навучыць талерантнасці.

Аня Нікалаюк, I „д” кл. Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Аня Іванюк

Васількі

Я не хачу, я не хачу, —
крычаў малы хлопчык,
калі пачуў,
як яго маці сказала:
„Нядоўна я адыду”.
Жанчына прытуліла сына
і стала яго суцяшаць,
што ўсё будзе яе прыпамінаць.
І шум лесу,
як яе калыханкі,
і сінія васількі,
як яе вочы
і залатыя каласы,
як яе валасы.
Хлопчык плакаць не перастаў,
ён вельмі маму кахаў...

Польска-беларуская крыжаванка № 6

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 2 (дадатковая жараб'ёўка): Параход, кош, пух, улоў, сценка, студзень, тыдзень, грам, Ян, рух, акно, атлет, год. Павага, рух, старт, стымул, цуд, медзь, сукенка, лань, яно, шоўк, анод.

Узнагароды, **каляровыя алоўкі**, выйгралі: **Маргарыта Харкевіч**, **Радзік Галёнка** і **Аня Пашко** з Нарвы, **Лукаш Габрылеўскі** з Новага Корніна. Віншуем.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

За сталом калектыў „Белай ружы"; шампанскае адкрывае Зіновій Галёнка

Праваслаўны Сільвестар у „Белай ружы"

Праваслаўныя вернікі адзначаюць Новы год паводле юліянскага календара, 14 студзеня. Пра гэта ведаюць усе, аднак з году ў год марнее гэтая традыцыя, асабліва ў малых мясцовасцях. У Гайнаўцы гэтую традыцыю падтрымлівае мясцовы прадпрымальнік Зіновій Галёнка...

У рэстаране „Белая ружа" каля трыццаці пар танцавала пад электронную і акардэонную музыку; гуляў таксама працоўны калектыў рэстарана. Паміж танцамі гасцей развесяляў кабарэ „Відэлец" з Беластока. У прыўзнятай атмасферы таго дня ў зале адчувалася свойскі, урачысты настрой. Арганізатары паклапаціліся і пра традыцыйную беларускую кухню.

Харчаваліся вяндлінамі, нарыхтаванымі паводле даўніх вясковых рэцэптаў. Кулінарным гітам быў г.зв. вэк — банка са свінымі галёнкай, кумпяком і паляндвіцай, запечанымі ў вясковай хлебнай печы спрактыкаванай гаспадыняй Марыяй Петручук з Чыжыкаў. Такі вэк апынуўся на кожным стале і смакаваў так, што нічога з яго не асталося!

Да поўначы гасцей наведаў Дзед Мароз, які падарыў кожнай жанчыне шакаладку і цукеркі, а мужчынам піратэхнічныя матэрыялы для феерверкаў. Апоўначы, на прывітанне Новага года, апрача шампанскага, на пляцы перад „Белай ружай" узвілася імпазантная светлавая ракета і прагрымела петарда. Успышкі было відаць і з напрамку „Леснічанкі", дзе таксама сустракалі Новы год.

У „Белай ружы" ад імя гаспадара і працоўнага калектыву рэстарана гасцей з Новым годам віншаваў аркестр.

* * *

У наступны дзень спытаў я гаспадара рэстарана Зіновія Галёнку пра яго рэфлексіі на тэму традыцыі праваслаўнага Сільвестра ў наваколлі Гайнаўкі.

— Я заўважыў, што бальныя касцюмы дам былі шыкарнейшыя, чым раней; значыць кампанія вельмі сур'ёзна паставілася да строяў. Модныя прычоскі, беларуская музыка і свае закускі спарадзілі вельмі сімпатычны настрой. Складвалася ўражанне, што гуляе адна зладжаная, дружная сям'я, інакш, чым у час змешанага навагодняга балю.

* * *

Згодна традыцыі, якую прадаўжаюць праваслаўныя вернікі, ноч з 13 на 14 студзеня была парой бестурботных гульняў моладзі, а гаспадарам — парой напружанай увагі. Трэба было добра забяспечыць форткі і вароты, якія гарэзнікі намагаліся памяняць, вынесці або схаваць. Найбольш дакучалі скупым гаспадарам і сварлівым жанчынам; ім, для прыкладу, апырсквалі фарбай вокны.

У гэты адзіны і непаўторны вечар, які называюць таксама шчодрым, багатым і гагатухай, жарты абыходзіліся бяскарна і ніхто на нікога не крыўдзіўся. Сёння людзі ўсё часцей забываюць гэтыя і іншыя вясёлыя звычаі.

Міхал Мінцэвіч

Плён VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Аніта Верамчук

Імпрэсія

Яшчэ хвілінка...
і дзіця ў калысцы
паставіць першыя крокі.
Яшчэ хвілінка...
і словы: мама, тата,
прагучаць з маленькіх
вуснаў.
Яшчэ хвілінка...
і школьныя абавязкі
запалоняць маладыя гады.
Прыйдзе час на каханне,
боль, расстанне, смутак.
Не паспееш аглянуцца — міне ўсё.
Толькі пад канец падумаеш:
— Ці я сапраўды жыў?

Вера Масайла

Памяці Тамашка Сідарука

Ціхі дом
чакае Тваіх крокаў...
А за акном счарнелы, збіты снег —
зімовай надзеі астаткі.
Як учарашні сон
радасці нашых дзён
знікаюць і адплываюць
у нябыт.
Паволі тухне ў зрэнках ночы
мая свечка.
Няўжо не расстане
Твайго маўчання лёд.
Няўжо не пачую
Твой забыты голас.
Ціхі дом надалей
чакае Тваіх крокаў.
Не магу зразумець
чаму без пары
пагасла сонца
і наступіла ноч.

Анна Садоўская

* * *

Папрашу залатую рыбку
здзейсніць усе мае мары.
Скажу ёй:
— Хачу быць шчаслівай.
Але рыбка не ведае,
што такое шчасце.
Адкажу залатой рыбцы:
— Не хачу быць адзінокай,
плакаць слязамі дажджу.
Выкіну рыбку ў мора,
няхай плыве.
Скажу ёй адно слова:
„Дзякую".
Задарма.

Рыгор Клімюк

Асенняя журба

Смутак...
няма надзеі,
сэрца плача,
яно не ведае сэнсу.
А жыццё праходзіць...
Трэба добра
скарыстаць
кожную хвілінку.

Папраўка

У вершы Цёткі Мальвіны „Дэтэктыў" намі дапушчаны былі дзве памылкі. Правільнае гучанне гэтых радкоў наступнае: *Так зіхацець не ўмее*; *Ды інфармацый шукаю я.* Перапрашаем.

РЭДАКЦЫЯ

Не парываць з традыцыяй

Гайнаўскі аддзел БГКТ існуе ад 20 мая 1956 г., а першым яго старшынёю быў інжынер Мікалай Тарасевіч з Завода сухой перагонкі драўніны. У 1960 г. аддзел налічваў 16 гурткоў БГКТ, апекаваўся 26 калектывамі народнай самадзейнасці (пераважна харавымі калектывамі). Самымі актыўнымі былі самадзейнікі з Ласінкі, Кленік, Кузавы, Нарвы, Дабрывады, Навасад, Арэшкава і Кляшчэль. Паўставалі таксама драмгурткі, прыбывалі маладыя актывісты з ліку інтэлігенцыі, рабочых і сялян.

Фота ВІКТАРА БУРЫ

На навагодняй вечарыне, арганізаванай Гайнаўскім аддзелам БГКТ

Аддзел працаваў паводле планаў, якія выходзілі насустрач запатрабаванню беларускай грамадскасці на культурныя мерапрыемствы. Трэба аддаць пашану тым дзеячам, якія шмат гадоў узначальвалі Гайнаўскі аддзел БГКТ, у тым ліку пакойнаму Аляксандру Іванюку, тадышняму настаўніку беларускай мовы і дырэктару беларускага ліцэя. Умеў ён сумясціць абавязкі дырэктара і настаўніка з грамадскай пасадай старшыні і з вялікай ангажаванасцю працаваць на карысць беларускай культуры.

Памятаюцца мне тадышнія навагоднія балі, запусты, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі — „белавежцамі" і гасцямі з БССР, журналістамі, экскурсіі па краіне і Беларусі. На беларускіх навагодніх балях зала Дома настаўніка (там змяшчаўся таксама аддзел БГКТ) заўсёды была запоўнена гасцямі, нават у гасцінных пакоях стаялі столікі. Заўсёды ўдзельнічаў у іх Аляксандр Іванюк са сваімі настаўнікамі, прыязджалі таксама настаўнікі з усёй Гайнаўшчыны. Прыходзіла моладзь і дарослыя з вуліцы Горнай, харысты. Сабраныя спявалі, танцавалі, весяліліся вакол стройнай ёлачкі. Апоўначы старшыня аддзела БГКТ выступаў з прывітаннем, затым гучэлі песні, віншаванні. У мінулым Гайнаўскі аддзел БГКТ быў адным з першых ва ўсім БГКТ.

А як распачаўся 2003 год у нашым асяроддзі? У гімназіі ў Чыжах арганізавалі Куццю (пісала аб гэтым „Ніва"). Душа радуецца, што ёсць яшчэ такія дырэктары, настаўнікі і моладзь, якім наша мінулае дарагое. Другі станоўчы прыклад даў войт Дубіцкай гміны Анатоль Паўлоўскі, які 13 студзеня арганізаваў навагодняе мерапрыемства з удзелам калектыву „Дабравушка" калгаса Навасёлкі Камянецкага раёна. Такога міжнароднага праваслаўнага „Сільвестра" павінны пазайздросціць вопытныя гайнаўскія дзеячы.

Кіназала ў Беларускім музеі пад канец года была адмалявана і мне здавалася, што вядзецца падрыхтоўка да навагодняга балю па старым стылі. Аднак сталася інакш. 13 студзеня г.г. дзверы Беларускага музея ў Гайнаўцы былі зачынены. Для многіх прыхільнікаў беларускіх навагодніх баляў быў гэта свайго роду шок. Ці навагоднія беларускія балі застануцца толькі ва ўспамінах?

Традыцыя не павінна загінуць. Яна яднае беларусаў, натхняе іх на далейшыя гады, становіцца стымулам для сустрэч на чарговых мерапрыемствах. Шкада, вельмі шкада, што парываем з традыцыяй.

Віктар Бура

Дастаеўскі і Праваслаўе

На чарговай сустрэчы ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку сабралася некалькі соцень слухачоў (настаўнікаў катэхізісу і зацікаўленых тэмай праваслаўных і іншаверцаў) на дакладзе архіепіскапа Лодзінскага і Познаньскага Сімана, доктара, ад'юнкта Лодзіскага універсітэта п.з. „Праваслаўе ў творчасці Фёдара Дастаеўскага". Даклад, разлічаны толькі на гадзіну, працягваўся больш за дзве. Як заўважыў саноўны дакладчык, немагчыма на працягу такога кароткага часу крануць такую шырокую і цікавую тэму жыцця (на наступны дзень, 27 студзеня, спаўнялася 122 гады ад смерці пісьменніка), з 60 гадоў якога 10 былі праведзены на катарзе, і творчасці „Івана Грознага ў літаратуры", „лютага таленту", аднаго з найвыдатных пісьменнікаў свету. Жорстка патрактаваны жыццём, пакутлівую, жорсткую і страшную праўду паказаў на старонках сваіх кніг, і, усё ж, дайшоў да таго, што „прыгажосць збавіць свет". У тлумачэнні архіепіскапа Сімана „прыгажосць" гэта Хрыстос, вера ў яго, увасабленне любові, даравання, уваскрашэння з упадку. Яго героі не „адкрываюць Амерыку", а найглыбейшыя, найбольш ціхія, таемныя закуткі душаў. Героі (апантаныя — „бесы" і святлістыя, якія нясуць надзею, быўшы нават на дне жыцця) з найважнейшых твораў, якія прадставіў яго высокапраасвяшчэнства, паўтараюць і шлях самога Фёдара Дастаеўскага — былога катаржніка, п'яніцы і іграка, веруючага не ўва „ўстаноўнага" праваслаўнага Бога, а ўверанага ўсім сэрцам старцамі, юродзівымі, адшэльнікамі, „простым" чалавекам. Бог прыходзіць да кожнага, і не нам належыць асуджаць, каму стаць перад ім, каму не. Чалавек выбірае паміж Мадонай і Садомам. Даўнія рэчы маюць прапасці, каб нарадзілася новае. Асабліва вылучае Дастаеўскі жанчын — тых, якія, як Марыя Магдаліна, падняліся з гразі ўпадку, якія нясуць святло і любоў і пойдуць за тым, каго кахаюць і разумеюць, на пакуты, на катаргу. У іх вусны ўкладвае словы Евангелля — Дабравесця. Не дзіў затым, што Царква, як казённая расійская арганізацыя, праз цэнзараў і оберпракураў Свяшчэннага Сінода, патрабавала змяняць ці выкідаць немалыя фрагменты кніг Ф. Дастаеўскага. Дастаеўскага называлі таксама „прарокам расійскай рэвалюцыі", якая захоча пажарам і крывёй знішчыць свет і веру. Як звярнуў увагу архіепіскап Сіман, не Усход нарадзіў такую рэвалюцыю. Дастаеўскі выказаў славянскую душу, разам з яе мукамі і святлом ды паказаў дарогу збаўлення. Паміраючы, папрасіў быў жонку адчытаць фрагмент Евангелля, якое адчынілася навыпадкова, на хрысце Ісуса. „Не затрымлівай, наша заданне — выпаўніць Закон", — сказаў Ісус Іаану. Хрышчэнне ў імя Ісуса нараджае новага чалавека, змывае грэх, падымае з найгоршага найлепшым. Ды не нам „асуджаць брата свайго"...

Выслухаўшы даклад, не ўсе згуртаваныя пакінулі залу. Яшчэ доўга працягваліся размовы з землякамі з-пад Белавежскае пушчы, знаёмымі, сваякамі, беларусамі. Епіскап Сіман Раманчук абяцаў даслаць сваім чытачам новы твор, як заўважыў, навеяны Дастаеўскім.

24 лютага Цэнтр праваслаўнай культуры запрашае на даклад прафесара Іераміі, архіепіскапа Вроцлаўскага і Шчэцінскага, п.з. „Катэхетычны і экзістэнцыяльны змест Вялікага посту".

(лук)

Лаўрэаты Астрожскіх прэмій

Капітул прэміі імя князя Канстанціна Васіля Астрожскага ўжо чатырнаццаць гадоў узнагароджвае асоб і арганізацыі за выдатныя заслугі ў развіцці культуры, думкі і духовасці праваслаўя і за дзейнасць у карысць яднання хрысціян. Сёлета Астрожскія прэміі, устаноўленыя рэдакцыяй штомесячніка „Przegląd Prawosławny", былі прысуджаны пяці лаўрэатам:

— архіепіскапу Адаму (Дубцу) — уладыку Пярэмышльска-Навасанчаўскаму;

— Грамадскаму камітэту сем'яў памардаваных узброеным падполлем у студзені-лютым 1946 г.;

— айцу Мікалаю (Алегу Бембелю) — манаху Жыровіцкага манастыра;

— епіскапу Іларыёну (Алфееву) — прадстаўніку Маскоўскага патрыярхату ў Бруселе;

— сястры Сяўронні (Бозіч) — ігуменні манастыра ў Патрыяршай Печцы.

Архіепіскап Адам атрымаў узнагароду за душпастырскую апеку над вернікамі адноўленай Пярэмышльска-Навасанчаўскай епархіі і за асаблівы клопат аб захаванні культурнай спадчыны лэмкаў. Ураджэнец вёскі Фларынка, якая для лэмкаў з'яўляецца сімвалам іх айчыны, ужо 20 гадоў нясе епіскапскую паслугу на землях, якіх жыхары пацярпелі ад акцыі „Вісла". Для лэмкаў і ўкраінцаў уладыка Адам стаў духоўным бацькам, які ахоўвае нацыянальную культуру і садзейнічае яе развіццю. Гэта па яго ініцыятыве вяртаючыеся на бацькаўшчыну лэмкі аднавілі шмат храмаў, у 1980-я гады заснаваны быў Уйковіцкі манастыр, у 1994 г. — кананізаваны св. Максім Горліцкі, а ў Горліцах паўстаў музей лэмкаўскай культуры.

Грамадскі камітэт сем'яў памардаваных узброеным падполлем у студзені-лютым 1946 г., якому старшынюе Параскева Антасюк, атрымаў прэмію за шматгадовае змаганне за высвятленне праўды аб пасляваенных падзеях на Падляшшы і ўшанаванне памяці бязвінных ахвяр. Дзякуючы гэтым намаганням у 2002 г. у Бельску быў адкрыты помнік у гонар замучаных атрадам „Бурага" фурманоў.

Епіскап Іларыён узнагароджаны за выдатныя заслугі ў пераказванні зместу жывой традыцыі праваслаўя на сучаснай мове. Званне доктара багаслоўскіх навук атрымаў на Оксфардскім універсітэце, яго спецыяльнасцю з'яўляецца патрыстыка, а асабліва вучэнні св. Сімяона Багаслова Новага і св. Ісаака Сірына. Аўтар пару дзесяткаў багаслоўскіх кніг на розных мовах. Некалькі гадоў быў памочнікам мітрапаліта Кірылы ў Дэпартаменце знешніх кантактаў Маскоўскага патрыярхату, дзе курыраваў экуменічныя кантакты. У 2002 г. стаў вікарным епіскапам мітрапаліта Антонія Блюма ў Сурожскай епархіі ў Вялікабрытаніі. Цяпер працуе прадстаўніком Маскоўскага партыярхату пры еўрапейскіх структурах у Бруселі.

Алег Бембель (а. Мікалай) атрымаў прэмію за ўмелае спалучэнне спраў веры з аховай каштоўнасцей нацыянальнай культуры і мовы. Ураджэнец Мінска, па адукацыі філолаг, вядомы перш за ўсё як выдатны паэт і аўтар выйшаўшай у 1985 г. у Лондане кнігі „Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс" (за што быў рэпрэсаваны). У 2002 г. прыняў манаскі пострыг. Займаецца выдаваннем часопіса „Жыровіцкая абіцель".

Сястра Сяўроння (Бозіч) — ігумення манастыра ў Патрыяршай Печцы ў Косаве — узнагароджаныя за дабрачынную дзейнасць у крайне складаных умовах.

Уручэнне ўзнагарод лаўрэатам адбудзецца ў Гайнаўцы ў маі падчас Дзён царкоўнай музыкі.

(вл)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

„Арэшкі" з Арэшкава (здымак зроблены на аглядзе ў Гайнаўцы)

Гвязда і калядаванне

26 студзеня многа людзей прыйшло паглядзець 30 груп калядоўшчыкаў, якія прыехалі ў Клуб забавы „Круг" у Беластоку з розных куткоў Беласточчыны. Мерапрыемства арганізавала Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Усіх сабраных прывітаў старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі. Зычыў ён самых добрых уражанняў і паясніў, што галоўнай мэтай мерапрыемства з'яўляецца выратаванне ад забыцця праваслаўнага абраду калядавання з гвяздай, а ўжо перш-наперш у гарадскіх асяроддзях.

Звыш трохгадзінны канцэрт прайшоў паспяхова. Слухачы мелі найлепшую нагоду пазнаёміцца з традыцыяй калядавання і агледзець цудоўныя, самыя розныя па форме, гвязды. 600 каляднікаў сабралася — пры такой непаўторнай нагодзе ў адным месцы.

Выступіла шмат гуртоў дашкольнікаў, школьная моладзь ды старэйшыя асобы (фальклорныя калектывы). Тых першых было найбольш. Была і салістка Аксана Сычэўская з Пачатковай школы н-р 26 у Беластоку. Дзіцячыя і маладзёжныя гурты былі з Супраслі, Беластока, Гайнаўкі, Ягуштова, Ласінкі, Новага Корніна, Арэшкава, Чаромхі і Бельска-Падляшскага. Старэйшыя калядоўшчыкі выступалі ў цёплай зімовай вопратцы, у кажухах, так як традыцыйна калядавалі ў вёсцы. Некаторыя калядоўшчыкі арыгінальна і непаўторна дазваляліся на калядаванне, а на заканчэнне развітваліся зычаннямі-віншаваннямі ды спявалі „Многая лета". Гэтак віталіся і развітваліся, між іншым, „Арэшкі" з Арэшкава, „Каліна" з Залук, „Малінкі" з Малінкі, „Красуні" з Краснага Сяла, „Цаглінкі" са Старога Ляўкова і „Журавінкі" з Агароднічкаў.

Усе спявалі з гарачым пачуццём. Усе на свой спосаб праслаўлялі нованароджанага Ісуса Хрыста. Плылі найчасцей такія калядныя песні: „Скінія златая", „Нова радасць стала", „Дзіўная навіна", „Учора з вячора", „Ражджаство Хрыстова". Каляднікі спявалі калядкі і ім вельмі часта спадарожнічаў акардэаніст. А вось капэла з Дубін спявае калядкі пад акампанемент шматлікіх музычных інструментаў. Каляднікі спявалі на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах. Усе атрымалі падарункі. І так закончылася чацвёртая прэзентацыя калядоўшчыкаў Беласточчыны „Гвязда і калядка". Да сустрэчы ў 2004 годзе!

(яц)

Мабыць забылі

Калісьці я за бальшавікамі проста прападаў і мне здавалася, што гэта людзі высокай маралі, духовай чысціні, праўды — і лепшых няма ў свеце. Мо таму іх любіў, што мая сям'я была скамунізавана, бо бацька мой і ўсе мае дзядзькі прападалі за камунізмам. Да таго ж яшчэ я ў пяцідзесятыя гады прачытаў многа кніжак савецкіх аўтараў, дзе камунізм, Ленін і Сталін праслаўляліся пад самое неба. Ды і польскі камунізм можна было любіць, бо ад яго рук мала хто пацярпеў так, як нашы браты за мяжою. У нас не было Салаўкоў, Курапатаў, Катыні, лагераў смерці ў Сібіры і неаб'ёмнай Радзіме Саветаў. А тое, што сёння пішацца аб нашых рэпрэсіях, дык гэта пераважна перамножаная праўда з няпраўдай.

У першым нумары сёлетняга „Часопіса" Лена Глагоўская напісала цікавы матэрыял пра сталінскі парадак п.з. „Расстраляная інтэлігенцыя". Жахліва чытаць тое, бо ж падумаць, колькі выдатных людзей літаратуры, палітыкі і навукі пастралялі бальшавікі лёгкай рукой. Гэтыя лайдакі правілі Беларуссю і ў іх руках быў лёс і жыццё кожнага сумленнага чалавека. Пастралялі тых, хто паверыў бальшавіцкай прапагандзе і вярнуўся з-за рубяжа сеяць у Беларусі новае пладароднае зярно. Паверылі гэтай хлусні і польскія беларусы, такія як Браніслаў Тарашкевіч, Язэп Гаўрылік, Ігнат Дварчанін, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Пётр Мятла, Максім Бурсевіч, Павел Валошын... Яны сядзелі ў польскіх турмах за праўду і былі заменены польскімі вязнямі з савецкіх турмаў. З'явіліся ў савецкі рай і праз 4-5 гадоў сталінская рука ўсіх іх ліквідавала. Адзін з астаўшыхся ў жывых, паэт Язэп Пушча, напісаў у міжваенны час верш:

Нарада траіх, пратакол н-р 5,
Яго не забудуць у нашай краіне,
Па ім павялі на Галгофу караць
Ад маці гаротнай апошняга сына.

А ці сапраўды не забудуць? Цяжка сказаць, але хутчэй, што забылі.

Мікалай Панфілюк

Цаніў людзей з усходу

У суботу, 4 студзеня г.г., жыхары Орлі назаўсёды развіталіся з Янам Кубаеўскім, які памёр 2 студзеня ў шпіталі ў Гайнаўцы. Пражыў 70 гадоў, з якіх больш за палову правёў у Орлі, якой быў вельмі адданы. Паховіны былі сціплыя, так як і ён сам пры жыцці. Хаця на працягу многіх гадоў працаваў у гмінным кіраўніцтве — быў першым сакратаром партыі, — у апошнюю дарогу не праводзіў яго ніхто ні з улад, ні з колішніх таварышаў.

Ян Кубаеўскі ад сваіх юнацкіх гадоў быў адным з вядучых суарганізатараў беларускай культуры ў Орлі. У 50-х гадах мінулага стагоддзя быў інструктарам Вясковага дома культуры, выступаў у калектыве „Арляне". Набыўшы вышэйшую адукацыю, трыццаць гадоў жыў у Кракаве, дзе 16 гадоў займаўся крыміналістыкай. У ваеннае становішча вярнуўся ў Орлю і стаў на працу ў партыі. На гэтым месцы — як ацэньваюць жыхары, — зрабіў шмат добрага сваёй гміне, асабліва прычыніўся да развіцця інвестыцый: пабудовы школы, жылога блока, дарог і тратуараў, асяродка здароўя, меркаванай пабудовы керамічнай фабрыкі... Ён астаўся чалавекам неабходным жыхарам і пасля трансфармацыі, калі ў Бельску-Падляшскім і Орлі звыш дзесяці гадоў вёў бюро юрыдычных парад. У выпадку неабходнасці памагаў бараніць свабоду слова (неаднойчы і я карыстаўся ягонымі парадамі), бо і сам у 50-х гадах быў карэспандэнтам „Газеты Беластоцкай".

З вялікім сентыментам ставіўся ён да людзей з-за ўсходняй граніцы, асабліва да герояў другой сусветнай вайны; ягоныя палемікі друкаваліся ў беларускай прэсе. Адышоў раптам, і хаця ў апошні час наракаў на здароўе, быў бадзёры і ветлівы. Жыў самотна (адзіная дачка жыве ў Кракаве), пакінуў у смутку суседзяў, знаёмых, прыяцеляў. У мяне асталіся ягоныя машынапісы і запісаныя на магнітафонную плёнку ўспаміны. Яшчэ год назад расказваў ён мне пра Орлю ў перыяд вайны:

„Немцы двойчы спалілі наш дом, хлявы, дабытак: адзін раз, калі прыйшлі, другі — калі ўцякалі. Каб не дапусціць да тушэння пажару, стралялі па палаючых будынках. Чуў я толькі енк і роў гарэўшай жывёлы. Калі падпалілі нашу хату, кінуліся мы ўцякаць у сховішча прыяцеляў па суседняй вуліцы. Сховішча было перапоўнена, вакол свісталі нямецкія кулі. Маліліся мы, каб фрыцы не кінулі ў наша прыстанішча гранаты.

Ураз пачулі мы грукат машын і пранізлівае «Ура!» Каля ўвахода ў сховішча пабачылі мы нейкія боты з халявамі. Чалавека не было відаць і мы думалі, што гэта нямецкі салдат. Бацькі паслалі нас, дзяцей, прасіць у яго даравання нам жыцця. Не паднімаючы галоў сталі мы цалаваць тыя боты, плакаць і прасіць змілавання. Раптам пачулі голас:

— Не бойтесь, я советский офицер. Вылезайте, немцев уже нет.

Убачыў я савецкага афіцэра з чырвонай зоркай на шапцы. Быў забруджаны, у падзертай кашулі, з аўтаматам у пакалечаных далонях. Колькі радасці, слёз шчасця і жыццёвага натхнення даў нам гэты запэцканы салдат. Цалавалі мы яго вопратку, абутак, рукі, плакалі ад радасці і шчасця; той момант запамятаў я назаўсёды. Ён устае перада мною ў кожную тую хвіліну, калі хто намагаецца зняважыць савецкіх салдат, паменшыць іх уклад у вызваленне нашай краіны. Многія з іх загінулі, іх магілы знаходзяцца на нашым могільніку пад руплівым наглядам вучняў. Усе ваенныя падзеі і пазнейшыя мае кантакты з савецкімі салдатамі пакінулі трывалы адбітак у маім характары, маіх палітычных перакананнях, маіх левых поглядах у будучыні. Ужо пасля вызвалення ад немцаў пазнаёміўся я з многімі савецкімі афіцэрамі, якія адносіліся да мяне як да сына, вучылі савецкіх песень.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Узяліся за адбудову з ваенных папялішчаў. Зарганізавалі Службу Польшчы, абмундзіравалі, надзялілі рыдлёўкамі і амаль штодзень працавалі пры пабудове дарог, дамоў, мастоў. Заснавалі Саюз польскай моладзі, Саюз вясковай моладзі, да якіх масава ўступала моладзь. Было ў тым нешта новае, прывабнае, важнае; з намі лічыліся. Запрашалі на вясковыя сходы, у прэзідыумы, цікавіліся нашымі меркаваннямі, ставілі маладзёжныя задачы і ў адміністрацыйным парадку прымушалі да навукі. Тлумачылі, што асвета вызначае будучыню, што Народная Польшча патрабуе адукаваных, мудрых, адважных і патрыятычных грамадзян. Вучылі, што непахісным прыяцелем палякаў з'яўляецца Савецкі Саюз, на які можна разлічваць у выпадку небяспекі. Не трэба было нас занадта пераконваць, бо мы самі дасведчылі смяротнай небяспекі. Дарэчы, у адносінах да нас яны былі ветлівыя і спагадлівыя — чаму ж мы мелі не любіць іх?

Нам у Польшчы можа здаецца, што з'яўляемся вялікай дзяржавай і маем права вучыць іншых, пагражаць, асцерагаць і нават шантажыраваць; мы, а не менавіта Расія. Але гісторыя вучыць, што з усходнім суседам павінны мы жыць згодна, балазе, што захад шматразова прыгадваў нам, што прыярытэтам НАТА з'яўляюцца добрыя адносіны з усходам, значыць — Расіяй."

* * *

Гаворыцца, што не жыў той, хто не пакінуў пасля сябе добрых успамінаў. Гаворыцца, што чалавек жыве датуль, пакуль жыве памяць аб ім. У Орлі Ян Кубаеўскі надоўга астанецца жывым.

Міхал Мінцэвіч

Бяссільны ў моцнага заўсёды вінаваты

Успаміны Яўгена СВІЦКАГА з Ячна.

У 1939 годзе была мабілізацыя, з Ячна 10 чалавек узялі. Пайшлі яны на поезд у Гарасімавічы, за імі бабы з дзецьмі ішлі, плач быў. Каля ставу, дзе пазней пахавалі Кунавіна, нямецкі самалёт восем бомбаў кінуў у поезд. Машыніст спыніўся і бомбы збочылі. Самалёт паляцеў на Гродна, а поезд паехаў далей.

Некаторыя са змабілізаваных ужо на трэці дзень вярнуліся, а некаторых аж пад Львоў завезлі; адзін прапаў, а апошнія вярнуліся. І рускія ў палон бралі; на Салаўкі сорак тысяч забралі, м.інш. майго цесця. Калі яго адпусцілі дахаты і ў Гарасімавічах вылез, то не даў рады дайсці дадому.

Яшчэ польскае войска ўкраінцы нападалі, білі і душылі. Але нашых ратавала тое, што па-нашаму ўмелі гаварыць. Пацер па-руску згаварылі і адпускалі:

— Нэ руш, то наш чоловік, — гаварылі.

Як прыйшлі рускія, то іх ніхто ў нас не вітаў. У Ячне школу зрабілі ў парафіяльнай хаце. Настаўнічала маладая жыдоўка з Гродна і настаўнік з нашай вёскі. Саветы ў нас да рэлігіі не ўмешваліся. У 1940 годзе ганялі людзей пад Ліпск і Каменную бункеры будаваць.

У Гродне войска многа было. Нашы свіней білі і ў Гродна вазілі. Пры ўездзе ў горад мяса штэмплявалі і пазней прадавалі. Плацілі 16 рублёў за худую саланіну і 18 рублёў за тоўстую. Гарэлка „Маскоўская" каштавала 16 рублёў за літр, пустая бутэлька — 1 рубель. 20 папяросаў каштавалі 80 капеек, а каробка запалак — 2 капейкі. Знойдзе які малы бутэлькі, прадасць і купіць папяросы з запалкамі.

Як насталі саветы, то ў Дуброве раён зрабілі. Сельсаветы ў Востраве і Ружаным Стоку былі, у кожным сельсавеце — міліцыянер. Мае мамы сястра матэрыял суседу адступіла, а ён данёс, што спекулянтка. І пяць гадоў ёй засудзілі, а двое дашкольных дзяцей мела. І ў поезд ужо пасадзілі, але акурат успыхнула вайна, той поезд збамбілі і яна дадому вярнулася.

22 чэрвеня 1941 года немец напаў на рускіх. Немец неба ўкрыў самалётамі. Недалёка Ліпска была руская застава, то немцы білі па Ліпску з гармат. Да нас немцы прыйшлі на другі дзень. Нямецкае войска заліло дарогі, бо рускія нават мастоў не пазрывалі. У нас кватараваліся лейтэнанты, іх сем'і паставаліся і па гаспадарах жылі.

Каля Гродна сорак тысяч рускіх салдат у абозе было. Нашы вазілі ім правіянт. Жаль было на іх глядзець. Як адзін дастаў кавалак хлеба, то дзесяць на яго нападалі. Адны яму капалі, а іншыя насілі і клалі трупы; усе яны там і пагінулі.

Немцы ўсе маёнткі забралі і людзей на работу ганялі. У Дуброве немца застрэлілі, то ўсю Дуброву спалілі, толькі лазня і клуб асталіся.

Калоць нельга было. Пасля, калі хто норму мяса здаў, то можна было ў Дуброву ў бойню везці, там мясар пячаткай штэмпляваў. Кармілі патаемна, у гумнах, і калолі. Хадзіў немец па хлявах і свіней глядзеў. Прыйшоў раз — свінню вялікую ўбачыў, прыйшоў другі раз — свінні няма. Дзе? — пытае гаспадара. Аддаў, немцу на станцыю завёз. Гарэлку гналі.

У астатні час нам, беларусам, немец брашуркі даваў: беларускую армію арганізаваць. Але ў нас нічога ім не ўдалося сарганізаваць. Некаторыя палякі ў нямецкую міліцыю ішлі. Пазней, як немцаў рушылі, то на чыгунку ў лес ганялі вартаваць — па трыста метраў адзін ад аднаго. Спярша нічога не было, а пасля будкі паставілі, каб схавацца. Паяўляліся партызаны, каля Саннікаў за Новым Дваром поезд выкалеілі, але нікога за гэта не пакаралі. У 1943 годзе ўвялі каменданцкі час. І застрэлілі некалькіх чалавек.

Як рускія сталі прыбліжацца, то ўкраінцы сталі ехаць; ад іх нічога нельга было схаваць. Аднойчы нашы закалолі паршука ў полі, прывезлі і схавалі. Мама кішкі чысціла. І немцы ў нас спыніліся. На панадворку пеўні хадзілі, злапалі яны два і пытаюць, колькі плаціць, але тата махнуў рукою.

У 1944 годзе рускія дайшлі да Гродна. На станцыі ў Бялянах за Новым Дваром склад з палівам збамбілі. У нас немцы ганялі мужчын акопы капаць, у гліне. 20 ліпеня 1944 года немцы пазрывалі масты і тут на рэчцы абарону зрабілі. Як пад Ліпскам два рускія танкі прайшлі, то немцы змыліся, але пасля вярнуліся. 22 ліпеня падышлі рускія. Тры снарады ў царкву далі і ў некалькі хат.

Я тады з татам у Грабянях быў. І мама ў Грабянях была, але ў іншым месцы, а дзед з бабай у Ячне. Немцы знайшлі закапанае мяса, тата прывёз, зварылі; трымалі ў каморы, а я адрэзваў і ў склеп насіў.

Падалі, што рускія перайшлі рэчку і немцы паўцякалі. Зараз паявілася руская разведка. Апоўдні 23 ліпеня рускія ўляцелі на панадворак. Адзін на вішню залез.

— Тебя снимут! — асцерагалі яго.

— Если не здесь, то в другом месте; такая наша жизнь.

Адзін убачыў немца, які не страляў, то і ён не стараляў да яго, але іншага немца, раненага, дабіў. Прыйшлі ў склеп.

— Немцев нет?

— Нет.

— Табак имеете?

Было сем папяросаў, а байцоў семдзесят. Пакуль яны тыя папяросы скурылі, дык немцы адступілі з бугарка.

26 ліпеня Грабяні былі занятыя, а Ячна яшчэ не. Ячна немцы падпалілі, каб дымную заслону паставіць; і дзедка мой тады згарэў.

27 ліпеня вярталіся мы дахаты. Тата збанок малака кіслага нёс. Рускія з жыта павылазілі і тым малаком дзяліліся. А нам столькі тушонак далі, што мы з татам ледзь прынеслі.

Немцаў саветы аж пад Карповічы адкінулі, але ў Аўгустаў не ўвайшлі. І рускія нас зноў сталі на акопы ганяць — бяссільны ў моцнага заўсёды вінаваты.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Вер – не вер

Астронку! Мне прысніўся надзвычай мілы сон, пра які спяшаюся табе данесці.

Вось быццам бы мы з маёй дачкою знаходзімся ў нейкай тэатральнай зале. Не ведаю, ці там ставілі нейкі спектакль, ці проста адбывалася нейкае мерапрыемства. Навокал мноства людзей, сярод якіх трапляюцца і знаёмыя. Бачу, як мы знаходзімся ў фае на першым паверсе. Усе стоячы гутараць, вітаюцца.

І раптам мы ўжо апынуліся на нейкім вакзале. Ніякіх цягнікоў я не бачу, бо мы знаходзімся ў пачакальні. Я сяджу на лаўцы. Дачка прывяла сяброўку і просіць, каб я папільнавала сяброўчынага сабачку, якога яна прынесла ў сумцы і паставіла на падлозе каля маіх ног. Дзяўчаты пайшлі крыху прайсціся па вакзале, можа нешта купіць у кіёску. Яны таксама выбіраліся ў падарожжа.

Я засталася з гэтым сабачкам. Бачу адчыненую вялікую сумку (тая даччына сяброўка мае яе спецыяльна для свайго сабакі), а ў ёй — цуда — такі пушыстенькі сабачка. Ну, кажу табе, зусім як цацка са штучнага футра. Я пачынаю „размаўляць" з ім, а ён такі ўжо міленькі, такі міленькі... Я прашу, каб даў мне лапку, а ён падае. Я бяру яго правую лапку ў руку, а яна зусім не мае кіпцюроў, мякенькая, быццам бы была плюшавая. І мне так прыемна. Прыемна было аж да таго часу, пакуль я не прачнулася. Што гэты сон мне варожыць?

Галіна

Галіна! Твой сон гаворыць аб тым, што ёсць у вас (мяркую — у цябе і дачкі) фальшывыя, ілжывыя сябры і прыяцелі. Аб гэтым сведчыць той **тэатр**, а што было там шмат людзей, дык гэта гаворыць за страту самастойнасці.

Што датычыцца **вакзала**, на якім ты знаходзілася пазней, дык гэта, на жаль, прадвяшчае нейкія клопаты, мітусню, цяжкасці ў справах і няўдачу.

Ва ўсіх гэтых непрыемных справах паяўляецца ясны праменьчык — гэта той міленькі сабачка, якога ты даглядала, а ён табе падаў сваю мякенькую лапку. Я ўжо не раз пісаў, што калі сабака кідаецца на чалавека, дык значыцца, што ёсць люты вораг, але калі сабака ласкаецца, дык знойдзецца добры, адданы прыяцель. Дык і прыкрыя справы не будуць такія прыкрыя, тым больш, што і сабачка „падаў лапу".

Астрон

Барані нас, Божа, ад стыхіі

У пачатку лета мінулага года ў вёсцы Грабавец Дубіцкай гміны ўспыхнуў ноччу пажар у хаце Анны Ярашук, мо ад нейкага кароткага замыкання. Гаспадыня і яе сын Яўген цудам ацалелі, бо Ганна прачнулася, калі агонь яшчэ не ахапіў цэлай хаты, разбудзіла сына і праз полымя ў вокнах выскачылі на двор. У хаце ўсё згарэла датла; засталіся адно пачарнелыя, сумныя і месцам напалову спаленыя сцены з пустакоў і цэглы. Спачатку здавалася, што трэба будзе ўсё раскідаць, аднак праведзеная экспертыза паказала, што сцены вытрымаюць на сабе цяжар будынка. Закіпела работа, бо і людзі, пераважна жыхары Грабаўца, сталі дапамагаць пагарэльцам. Дапамагалі сваякі ды і жыхары навакольных вёсак ахвяравалі грашовую дапамогу.

Адбудовай поўнасцю заняўся сын Ганны Яўген. Гэта працавіты мужчына і свамі залатымі рукамі стаў адбудоўваць хату. Ён быў і мулярам, і тынкоўшчыкам, і сталяром. Дапамагаў печніку, а сцяноўку нават сам паставіў. Яўгену дапамагалі сваякі і суседскія хлопцы. Людзі па вуліцы каля млыноў, дзе жыве Ганна, вельмі дружныя — жывуць ціха і мірна, як адна сям'я. Я, калі быў лістаношам, заходзіў да Ганны і Яўгена і бачыў, як паспявае будова. Аднойчы Ганна расказала мне пра пажар сваёй хаты...

У хаце згарэла ўсё, апрача Евангелля ад Іаана і іконкі Ісуса Хрыста, якіх агонь не ахапіў. Паказала мне іх — яны ляжалі на стале. Не цуд гэта? І калі я наведаў апошні раз Ганну і Яўгена, яны ўжо жылі ў адрамантаванай хаце, якая стала яшчэ прыгажэйшай, чым была да пажару. Ну, але якой гэта абышлося цаною? Барані нас, Божа, ад агню і іншай стыхіі.

Мікалай Панфілюк

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Афрыканскія страусы марозаў не баяцца

Зіма трымае. Пра трыванне страусаў у нашым клімаце расказвае Зіновій ГАЛЁНКА, уласнік гаспадаркі „Купала" ў Арэшкаве.

Страус, гэта найбуйнейшая сёння птушка. Даўней шырока распаўсюджаны, сёння на волі выступае толькі на поўдзень ад Сахары, пражываючы на адкрытых раўнінах саваннаў. Магутныя ногі з двума пальцамі (усе апошнія птушкі маюць па тры-чатыры пальцы) дазваляюць яму на хуткі (да 70 км./гадз.) і працяглы бег. Жыве 40-50 гадоў, вытрымоўвае тэмпературы ад -40°C да +50°C. Вага яго даходзіць да 130 кілаграмаў, а рост да 2,5 метраў.

Сёлета ўпершыню зімуем страусаў у нашай гаспадарцы. Адну пару іх трымаем ад ліпеня. Я ведаў, як яны вядуць сябе летам, але не ведаў, як яны будуць трываць зіму. Пабудавалі мы ім цёплы домік у афрыканскім стылі. Я чуў, што яны не баяцца халадоў і ў сёлетнія студзеньскія маразы пад -20°C яны ахвотна прабывалі вонкі. Калі ішоў снег, дык яны былі як чарапахі, бо на іхнія хрыбты насыпалася многа снегу і ў гэтакім адзенні яны хадзілі па загарадзе. У іх прасторная загарада, якая займае цэлы садок. Зерне сыпалі мы ім на снег і яны дзяўблі. Большасць зімовага часу страусы праводзілі на свежым паветры, а толькі нанач хаваліся ў домік, дзе няма ветру.

— А як зімуюць тарпаны? — спытаў я спадара Галёнку.

— Вельмі добра, брыкаюць па снезе. Кармлю іх дастатковай колькасцю аўса і сена. Цяпер тут шэсць конікаў, у іх ліку два маладыя жарабцы з мінулага года, а тры кабылкі жаробныя і ў сакавіку спадзяемся прыплоду.

Відаць, што Зіновій Галёка, яшчэ нядаўна жыхар сталіцы, любіць і разумее жывёл. Мяне на „Купале" захапіў яшчэ адзін факт: там нават зімою звярына і птушкі, вялікія і малыя, калі захочуць могуць самі выходзіць з хлява на двор. І прыгадаў я, як іншыя земляробы маюць вясною клопат са сваёй жывёлай, напрыклад, з каровамі, калі іх першы раз пасля зімы выпускаюць на пашу. Тая жывёла, зачыненая ўсю зіму ў хляве, проста дзічэе. Не інакш і коні, якіх цяпер гадуецца толькі дзеля ўзбагачэння і не запрагаецца ў хамут, разгультайваюцца і недзе губляць сваё наканаванне для дапамогі чалавеку. На гаспадарцы „Купала" можна прыглянуцца поўнай прыроднай зладжанасці.

Міхал Мінцэвіч

Твая кроў ратуе жыццё іншым

Пад такім лозунгам адбылася сустрэча прадстаўнікоў Таварыства Польскага чырвонага крыжа з найлепшымі донарамі з Гайнаўскага павета.

Найбольш заслужаным донарам былі ўручаны значкі „Заслужаны ганаровы донар" I, II і III ступені, ганаровыя значкі ПЧК, дыпломы Галоўнага праўлення ПЧК ды рэчавыя ўзнагароды.

Найвышэйшымі ўзнагародамі — значкамі „Заслужаны ганаровы донар" I ступені былі ўдастоены: Раман Алексяюк, Веслаў Каранкевіч, Станіслаў Кульваноўскі, Юры Лукша, Эдвард Мішчук, Роберт Алехна і Ян Шатыловіч. Усе яны аддалі больш за 18 літраў крыві.

Значкі „Заслужаны ганаровы донар" II ступені (для тых, што аддалі звыш 12 літраў „дару сэрца") атрымалі: Кшыштаф Фалькоўскі, Міраслаў Кавальчык, Дарыюш Клапатоўскі, Вітальд Казлоўскі, Ізабела Мазурук, Міраслаў Міхалюк, Юзэф Сівіцкі, Уладзімір Троц і Ян Бахмат.

34 донарам былі ўручаны значкі „Заслужаны ганаровы донар" III ступені (за больш 6 літраў крыві).

За прапагандаванне ідэі донарства Ганаровы значок ПЧК II ступені атрымала Марыя Зданоўская, старшыня Раённага праўлення ПЧК у Гайнаўцы і такі значок IV ступені — Барбара Мусюк, апякунка гуртка ПЧК у Пачатковай школе н-р 6 у Гайнаўцы. Ганаровыя граматы Галоўнага праўлення ПЧК за ўспамогу і падтрымку донарства былі ўручаны Уладзіміру Пятрочуку, Анатолю Ахрыцюку і Віктару Сахарчуку.

Янка Целушэцкі

Беларуская песня 2003

Яшчэ ў рамках X Агульнапольскага фестывалю „Беларуская песня 2003", арганізаванага Галоўным праўленнем БГКТ пад ганаровым патранатам міністра замежных спраў РП Владзімежа Цімашэвіча, адбудуцца наступныя мерапрыемствы:

— 15 лютага (субота) павятовы агляд фестывалю ў Беластоку (будынак ГП БГКТ), пачатак а гадзіне 16;

— 16 лютага (нядзеля) павятовы агляд у Бельскім доме культуры, пачатак у 14.00;

— 23 лютага (нядзеля) цэнтральныя элімінацыі фестывалю ў Гарнізонным клубе ў Беластоку, па вул. Кавалерыйскай 70, пачатак а 10 гадзіне;

— 8 сакавіка (субота) гала-канцэрт фестывалю ў зале Спартыўнага клуба „Влукняж" у Беластоку, па вул. Антанюкоўскай 60, пачатак у 16 гадзін.

Арганізатары запрашаюць усіх зацікаўленых на гэтыя мерапрыемствы.

(яц)

У Бельскай гміне

Вада ва ўсіх вёсках

Сёлета ўлады Бельскай гміны намераны закончыць пабудову дарогі ў Шасталах ды водаправодаў у Дэнісках, Грыневічах-Вялікіх, Гусаках, Жэпневе і Сталавачы. Калі вышэйзгаданыя інвестыцыі будуць закончаны, тады ўжо ўсе вёскі ў гэтай гміне будуць падключаны да водаправода.

(яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.anekdotov.net

Адгаданка...

Насільшчыца

(паліндрам)

У халодным, цёмным лесе лісіцы голад дапякае,
Яна забрацца ў вёску і паесці разважае.
Зайшла на панадворак, а там гаспадаром баран
З задзертымі рагамі шпацыруе быццам пан.
Кажа яна яму: Браток мой, непарадак у цябе!
Ты ж ведай: цяпер чысцютка мусіць быць нат у хляве;
Мы ж пад еўрапейскія пружынімся стандарты,
Як прыдзе камісар, дык штраф улепіць не на жарты.
Вось, міленькі, глядзі, што курачкі твае ўчыняюць:
Грабуць пясок, узнімаюць пыл ды пер'е раскідаюць...
Каб чысціня была тут, іх трэба прыхаваць!
Так-так; і па сакрэту я хачу табе сказаць,
Што я бывала ў Лондане, Бруселі і Сарбоне
І бачыла, як там трымаюць кароў, свіней і коней.
Капытныя ў палацах там жывуць, а куры
Не на градках у курніках сядзяць, але ў натуры:
У лесе, свабодна, на пяньках, галінах, ралах і суках;
Такі й да нас закон ідзе, што мецьме волю кожны птах.
Дык курам волю дай, а ты, баронам, у пакоі шпар!
Йэ-э-эс! — бэкнуў баран. Ура!.. І быццам у Зімовы пралетар
Рвануў у дом. І лбом у дзверы гракнуў: бах!
Аж залацістых зорак круг завіраваў, як сцяг...
_ / _ _ _ _ / _ _ _ _ _ _ курэй за плот, спяшала
Ды за сабой хвастом надворак замятала.

(Ш)

Літары рашэння прыкрыты гарызантальнымі рыскамі, словы раздзелены косымі рыскамі. Фраза, якая з'яўляецца рашэннем паліндрама, чытаецца аднолькава спераду і ззаду, напрыклад *аліва лавіла*. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 50 нумара.

Гарызантальна: бабіна, дарога, пароль, Лада, нара, Браціслава, клак, раса, праўда, карбас, калюга. **Вертыкальна:** Бачыла, Напа, Даль, галера, Ротмістраў, дабрак, Навара, кладка, Сапега, прас, Дака. **Рашэнне:** Бабіна дарога — ад печы да парога.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

... ды мой „паліндрам-монстар"

Адгаданка, якая прапануецца вышэй, нагадала мне, што ў першай палове 90-х мінулага стагоддзя я таксама склаў паліндрам (выпадкова). І не было б у тым нічога асаблівага, калі б не яго даўжыня. Гэта не слова і не два, а канкрэтна — два сказы. Пры захаванні такога-сякога сэнсу яны фактычна аднолькава чытаюцца спераду ўзад і ззаду наперад.

Калі б вас калі-небудзь дакаралі, што беларуская — гэта не мова ці што там яшчэ, дык пастаўце такому зламысніку задачу скласці на яго мове паліндрам даўжэйшы за мой беларускі:

— *Я ТУТ МЕНАВІТА, А ПРАКУРАТАР У КАРПА. АТ, ІВАН, ЕМ ТУТ Я.*

Не сумняюся, што бываюць (ёсць — трэба толькі да іх дайсці) і даўжэйшыя. Але і гэты павінен уражваць.

Аляксандр Максімюк

У чарзе за Гібай

Стаў я ў чаргу да кіёска. От, цікава, думаю, як я даўно чэргаў не бачыў! Калісь і чэргі былі, і грошы былі, адно тавараў не хапала. Цяпер тавараў удоваль, грошай няма, дык і чэргаў быць не павінна? Дык чаго ўсе тутака паставалі, бы нешта калісьці „кінулі" і кожны станавіўся за абы-чым — а, раптам, прыдасца?

— За чым стаіце? — пытаюся таго, што стаяў перада мною.

— Не за чым, а за кім! — адвярнуўся да мяне сваім выразістым тварам курп Збышка Насквaрка, аграном па прафесіі, спявак і мовалюб-аматар. — І па што.

— Ну, дык па што стаіш?

— Па беларускі каляндар.

— Значыць, па „Ніву". І ўсе так паставалі?

— А гэта і быць можа! — Збышка гаварыў па-беларуску з адчувальным курпёўскім акцэнтам, які смешыць палякаў не менш, чым чэшскі.

Але нашы суседзі ў чарзе зусім не засмяяліся, а хутчэй шаляснуліся ўбок. І тыя хто стаяў спераду, і тыя, што ззаду.

— Я, ведаеш, Вандал, ужо ўпэўнены, што яны стаяць менавіта па той каляндар! — басавіта засмяяўся Збышка. — А чарга, як калісь за любівым мясам. Яшчэ крышку, дык цяжарныя з левага боку падыходзілі б. За той цяжкі час і ў мяне вырас жывоцік.

Чарга сунулася хутка. Да акенца дайшоў Збышка.

— „Гібы" юж не ма? Проша пані?

— Не ма! — з-за шкла азваўся злосны бас. — І не бэндзе!

— Ну, дык пан не заробіш на „Ніве"! Трэба было больш заказаць! Гэта ж, паночку, не парнаграфія!

Кіяскёр чмыхнуў: ён жа адзін з найгалоўных колішніх беластоцкіх змагароў з гэтай плягай!

— Гэта горш парнаграфіі! — заляментавала цётка, што стаяла за мною. — Памятаеце тое Сэрцайка! Мой стары ад апошняе старонкі „Ніву" пачынаў, а потым розныя фокусы выдумваў! Цьфу!..

— Дык гэта добра! — Збышка здаўна ведае Сэрцайка, а, нават, як пару дзесяткаў беластоцкіх мужыкоў, выў да яго па начах ад жарсных пачуццяў. — Гэта ж было наша натхненне!

— Іду ў іншы кіёск! — паглядзела цётка на Збышку з непрыхаванай злосцю. — Што за народ!

— Чуеш, Вандал, я — народ ваш, хоць я нетутэйшы!

— Жонка ў цябе тутэйшая.

— От, і маецца з вамі ваша Тамара! — наступная цётка з рассыпанай чаргі тым разам была з раёна, дзе жывуць Насквaркі. Гэта як рукой падаць. Пэўна, гэтая панця ў зялёным паліто не ў адным кіёску пыталася пра ніўскі каляндар.

— Ой, маецца, маецца! Вядома, з курпам толькі беларуска вытрымае... — усміхнуўся сваімі белымі зубамі праўнук, унук і сын курпёўскіх пчалаводаў. — Ідзем, дзяўчаты, да мяне ў госці. Пап'ем зялёнай гарбаткі, мядку паямо...

Цётка напалоханая колішнімі сэрцайкавымі парадамі змылася хутчэй, чым Збышка дагаварыў сваю прапанову. А Тамарына знаёмая не адмовілася. Па дарозе ў квартал Бэма купілі мы яшчэ шэсць календароў разам, вядома, з „Нівай" і зайшлі ў гастраном. Трэба ж неяк падтрымліваць айчыннае пчалаводства і рэдакцыю тыднёвіка ўсіх беларусаў.

Вандал Арлянскі

Хай выйграюць найлепшыя

У лесе набліжаўся час выбараў. Мядзведзь Сандар Жоржавіч ад пэўнага часу рыхтаваўся насадзіць узлескі сваімі. Ведаў, што змяя Ссапія і вуж Ззянон таксама не спяць.

— Хай яны і не думаюць, што перасмыкнуцца! — рашучая ўпэўненасць штораз перасмыквалася ў яго думках.

Выбарчай гарачкі набралася ўсё ўселясное кіраўніцтва.

— Узлескі мусяць быць і будуць нашы, мусяць быць і будуць Сандаравы! — чакаючы мядзведзя прамаўляў дзяцел Стукач, рыхтуючы грунт пад стратэгічны сход: утоптваў мяккі снег.

Урэшце ва ўсёй сваёй веліччы высунуўся Сандар Жоржавіч. Адразу ўзяўся за справу.

— Дайшло да нашых вушэй, што некаторыя стартуючыя ва ўзлескавыя рады не да канца адданыя мне. Трэба ім пільна прыгледзецца. Пабачыць, колькі дабра да гэтай пары ўчынілі дзеля мяне, як ахвяроўваліся, ці выпадкам не па дарозе ім было ў лясных вандроўках са змяёй Ссапіяй ды вужом Ззянонам.

— Сандар ты мой адзіны, я бачыла, як мая суседка зубрыха Ванюха рыла ля дарогі ў вашу бярлогу. Я яе ведаю! Яна, падлюга, хоча ў раду Паўднёва-заходняга ўзлеску, — спрабавала выканаць свой абавязак лань Гаўрусіха.

— Добрая лань, — пахваліў яе мядзведзь. — Хай Стукач тое зафіксуе і зробіць з Ванюхай парадак ды пакажа, дзе яе месца. Іншыя выпадкі заяўляйце Стукачу. Ён будзе ведаць, што рабіць, каб не было рыцця без толку і патрэбы.

Прыслухоўваючыся сходу крыху збоку дзік Свіналыч спунсавеў. Мядзведзь заўважыў ягоную збянтэжанасць.

— Ды не, дзік-друг ты мой, не неспакойцеся. Я ж ведаю, што рыеце калі трэба, дзе трэба, і з добрым намерам. А, можа, я ўсяго не ведаю? Ці не бліжэй вам да Ванюхі?

— Цьфу, цьфу, цьфу! — трохкроць запярэчыў дзік і ўспомніў старую лясную пагаворку: — Дзе дзік, а дзе зубёр!

— Ну, дык добра. Выбары не за марамі. Хай выйграюць найлепшыя, нашы! — мядзведзь лозунгам закончыў сход.

Вярнуўся ў сваю бярлогу. Прыдрамаў на хвілінку. У сне ўбачыў, як ува ўсіх узлесках рые звярына, нават птаства, і ўсе яны ўсё бліжэй ды бліжэй да мядзведжай сядзібы. Прачнуўся, задыханы. Вызірнуў у лес. Аддыхаўся. Супакоіўся. Наўкол ціш ды спакой. Толькі ў далечыні, пад лесам, чуваць было таямнічы тупат. Гэта набліжаліся выбары.

МакХолад

І я падслухаў

Не толькі паважаная Ада Чачуга падслухала, што, маўляў, „падоіш карову з гною, завязеш малако ў злеўню і грошыкі атрымаеш" („А ну яе, з тою Уніяй", „Ніва" н-р 4), а цяпер вымагаюць, каб карова, яе цыцкі і сам хлеў былі чыстыя, як у палацы і тады мо малако пойдзе ў рух. Але і я не раз чуў ад тых асоб, якія працавалі ў Бельгіі, Італіі, Германіі ці ЗША, што там, хаця такая чысціня ў хлявах і цыцкі не ў гнаі ды малако і ўсе харчы вельмі чыстыя, іхняя ежа без смаку, быццам штучная. Смаку іхняга малака далёка да нашага, надоенага ад кароў з гноем. Нашы прадукты намнога смачнейшыя ад слаўных заходніх. Чаму так дзеецца? Мо таму, што ў нас людзі дурныя, а там замнога разумных ды хімікатаў росту ў ежы больш чым розуму ў чалавека.

Мікалай Панфілюк

ISSN 0546-1960